Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 ЖНІЎНЯ 2009 г.
ЧАЦВЕР
№ 160
(26518)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Віцебскі мільён тон — НЕ МЯЖА

На Віцебшчыне ўчора раніцай ужо намалацілі больш за мільён тон збожжа. І гэта яшчэ не ўсё з сёлетняга залатога ўраджаю. Прама на полі гаспадаркі, дзе камбайны намалацілі «мільённую», старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ павіншаваў земляробаў са знакавай падзеяй. У суверэннай Беларусі такога багатага ўраджаю яшчэ не было.

— Мы ўдзячныя ўсяму аграпрамысловаму комплексу Віцебшчыны, — адзначыў губернатар Прыдзвінскага краю. — А таксама ўдзячныя прадпрыемствам рэспублікі за выдатную тэхніку, якая была пастаўлена. А гэта практычна 2000 адзінак энерганасычаных камбайнаў, трактароў, якія даюць магчымасць з мінімальнымі стратамі ўбіраць ураджай у няпростых умовах. Мы не скардзімся на дрэннае надвор'е, хоць у нас больш за 70 працэнтаў збожжа — палегліца. 30 працэнтаў ураджаю яшчэ стаіць на палях. Таму давядзецца шмат папрацаваць. Трэба, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, не страціць ні аднаго зярняці. Сёлета Віцебшчына значна перавысіць ураджай мінулага года. Пры тым што ўраджайнасць ніжэйшая. А саму ўборку сёлета мы пачалі толькі 5 жніўня — фактычна на тры тыдні пазней за паўднёвыя рэгіёны краіны.

Губернатар уручыў механізатарам падарункі.

І «Звязда» павіншавала герояў. Пагутарыў з камбайнерамі і кіраўніком гаспадаркі «Дружбінец» .

— Добрыя ў нас работнікі, — расказвае **кіраўнік гаспадаркі Віктар ЦАПОТА.** — Першы «тысячнік» у раёне Ігар Руколь, пад тысячу намалаціў Віктар Мялежка, Уладзімір Юрэвіч перавёз на МАЗе каля 2 тысяч тон збожжа. Калі ў сярэднім па гаспадарцы зарплата 780 тысяч рублёў, то камбайнеры зарабляюць па 200 тысяч рублёў штодня. Усяго ў нас восем камбайнаў. Тэмпы ўборкі панізілі дажджы. На сёння ўбралі ўжо на 1823 гектарах, а ўсяго ў нас трохі больш за 2 тысячы гектараў. Каб развіваць гаспадарку, будуем і новы сушыльны комплекс...

Дарэчы, як адзначыў старшыня Віцебскага аблвыканкама, больш чым 60 працэнтаў сушылак трэба мяняць. У рэгіёне ўжо дзейнічаюць і сушылкі на колах, створаныя мясцовымі прадпрыемствамі.

На наступны год на Віцебшчыне ставяць задачу намалаціць пад 2 мільёны тон збожжа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара.
Сенненскі раён.

АСІНТОРФ. 10-ы ПАСЁЛАК...

Гляджу на карту Віцебшчыны і не разумею, што гэта за назвы ў населеных пунктаў: Пасёлак № 11, Пасёлак № 8, № 2, № 4, № 10.

Не ведаю, чаму выбіраю менавіта дзясяты і еду на скрыжаванне трох раёнаў — Лёзненскага, Аршанскага і Дубровенскага. Адсюль і да мяжы з Расіяй, каб не лес ды балоты, усяго з дзясятак кіламетраў. Але адна справа чытаць і разглядаць на карце незнаёмыя назвы і зусім іншая — блукаць па лясных, прыдатных толькі для трактароў і коней дарогах, марна шукаць нічым не пазначаныя пункты. Але калі ехаць з г.п. Арэхаўск на вёску Верацею і нікуды не збочваць, дык патрапіш у тупік з некалькімі вольнараскінутымі сядзібамі. Гэта і будзе Пасёлак № 10, колішняя ўдарная будоўля, якой сам Ленін надаваў велізарнае значэнне, задумваючыся над планам славутага ГОЭЛРО.

У пасёлку мне пашчасціла знайсці некалькі жыхароў — апошніх. І каб не іхнія ўспаміны, нізашто не паверыў бы, што тут часам жыло да тысячы чалавек. Не верыцца, гледзячы на фотаздымак, што гэтыя людзі мацавалі эканоміку СССР, яны здабывалі торф для першай Беларускай электрастанцыі.

Мала хто ўяўляе цяпер, што такое здабыча торфу ў цяжкія дваццатыя і трыццатыя гады і не менш цяжкія пасляваенныя саракавыя і пяцідзясятыя. А яны ведаюць. Гэта была знясільваючая ручная праца, часам па самыя пахі ў вадзе. Засталіся адзінкі з тых сведак росквіту першай і бадай самай вялікай торфараспрацоўкі на тэрыторыі Беларусі пад назваю Асінторф. Насамрэч гэта — гераічныя людзі, нягледзячы на тое, што да торфу даўно не маюць ніякіх адносінаў. Варта пералічыць кожнага з іх за ікнюю адданасць зямлі і неверагодную цярплівасць. Злева направа Кацярына Гарбачова, Сцяпан Селязнёў, Таццяна Якушэнка, Ганна і Якаў Шкрэдавы.

Дакладнай даты з'яўлення Пасёлка № 10 не назвалі нават у асінторфаўскім музеі, але пакольк на агромністым балотным масіве каля Юр'ева Вострава колішняга Арэхаўскага раёна торфараспрацоўка па распараджэнні першага старшыні Саўнаркама Уладзіміра Леніна пачалася ў 1918 годзе, можна арыентавацца на прыблізную дату. Тым больш, што ў 1926 годзе было пачата будаўніцтва БелГРЭС і патрабавалася вялікая колькасць запасаў паліва. Пасёлкі развіваліся імкліва, па вярбоўцы з усіх канцоў СССР на сезонныя працы сюды сцякаліся дзясяткі тысяч людзей, з суседніх расійскіх абласцей і бліжэйшых раёнаў Віцебшчыны і Магілёўшчыны. Гэтых людзей і дасюль у Асінторфе называюць «гапкамі». На месцы самага аддаленага 10-га пасёлка стаялі баракі для пражывання ў вясновa-асенні час, лазня, крама, клуб. У вайну ў гэтых месцах дзевяць месяцаў стаяў фронт і ўсе пабудовы былі цалкам разабраныя на бліндажы, брусцверы і зямлянкі, а некалькі цагляных дамоў былі ўшчэнт разбітыя. Але пасля вызвалення пасёлак зноў вырас. З'явілася ў ім і пачатковая школа. На сезонныя работы прыязджалі ў асноўным жанчыны на штабялёўку брыкету і на пагрузку. Асабліва шмат было з Мардовіі. Жылі ў спецыяльных інтэрнатах для жанчын. Былі і жанчыны-экскаватаршчыцы, і размыўшчыцы торфу, і нават слесары-рамонтніцы. Ганна Шкрэдава — старэйшая жыхарка 10-га, памятае, як доўга пасля вайны жылі ў зямлянцы. Яе бацькі жылі дагэтуль у 7-м і былі, як усе, тарфянікамі. Ганна працягвала іхнюю справу, бо іншай працы не было. У калгасах не плацілі зусім, а калі не было ўраджаяў, дык за працадні нічым не разлічваліся.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

СУСТРЭЧА ПРЭЗІДЭНТАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ АДБУДЗЕЦЦА 27 ЖНІЎНЯ Ў СОЧЫ

У адпаведнасці з дасягнутымі раней дамоўленасцямі 27 жніўня ў Сочы адбудзецца сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Расіі.

Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў абмяркуюць шырокі спектр пытанняў двухбаковага супрацоўніцтва, а таксама актуальныя праблемы міжнароднага парадку дня.

У ліку найбольш важных тэмаў — гандлёва-эканамічныя адносіны, ход саюзнага будаўніцтва, сумесныя меры па пераадоленні негатыўнага ўплыву сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу, забеспячэнне бяспекі абедзвюх краін, узгодненыя дзеянні ў знешняй палітыцы, іншыя важныя для беларускага і расійскага народаў пытанні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

МВФ НЕ РЭКАМЕНДУЕ ЗМЯНЯЦЬ ПАЛІТЫКУ ВАЛЮТНАГА КУРСУ І ПРАВОДЗІЦЬ ЧАРГОВУЮ ДЭВАЛЬВАЦЫЮ БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ

Аб гэтым паведаміў журналістам у Мінску дырэктар Еўрапейскага дэпартамента Міжнароднага валютнага фонду Марак Бэлька, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Мы думаем, што дзеючы цяпер рэжым курсаўтварэння правільны. Ён забяспечвае стабільнасць і некаторую неабходную гібкасць беларускага рубля», — адзначыў дырэктар Еўрапейскага дэпартамента МВФ. «Мы не абмяркоўвалі з урадам і Нацыянальным банкам гэта пытанне і не рэкамендавалі змяняць рэжым курсаўтварэння, — дадаў ён. — Насупраць, уся праграма эканамічнай палітыкі арыентавана на тое, каб умацаваць сістэму і стабільнасць беларускага рубля». «Калі гаварыць адкрыта, то дэвальвацыі ў аглядным будучым не будзе», — растлумачыў Марак Бэлька. Ён нагадаў, што курс беларускага рубля вагаецца ў межах устаноўленага калідора. «Гэта правільная сістэма, і мы працуем над яе умацаваннем», — сказаў прадстаўнік МВФ.

МВФ НЕ ВЫКЛЮЧАЕ МАГЧЫМАСЦІ ПРАДАСТАЎЛЕННЯ НОВАЙ КРЭДЫТНАЙ ПРАГРАМЫ Ў 2010 ГОДЗЕ

Аб гэтым ішла размова на сустрэчы кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзіміра Макея з дырэктарам Еўрапейскага дэпартамента Міжнароднага валютнага фонду Маракам Бэлькам, паведамілі БЕЛТА ў Адміністрацыі Прэзідэнта.

Як было падкрэслена на сустрэчы, характар адносінаў паміж Беларуссю і Міжнародным валютным фондам стаў больш канструктыўным і прагматычным. Марак Бэлька адзначыў станоўчы эфект ад рэалізацыі ў нашай краіне мерапрыемстваў па ўдасканаленні падыходаў да правядзення бюджэтна-падатковай і грашова-крэдытнай палітыкі, забеспячэнні фінансавай стабільнасці. У час размовы бакі таксама абмеркавалі актуальныя пытанні рэалізацыі мераў па лібералізацыі бізнэс-асяроддзя і стымуляванні дзелавой актыўнасці, умацаванні банкаўскага сектара, аптымізацыі дзяржаўных расходаў, актывізацыі інвестыцыйных праектаў і якасці інвестыцый. Марак Бэлька паведаміў, што цяпер вядуцца кансультацыі з урадам Беларусі і Нацыянальным банкам па завяршэнні агляду па праграме «стэнд-бай». У той жа час ён не выключыў магчымасці работы з Беларуссю ў наступным годзе па новай крэдытнай праграме. Пры гэтым Уладзімір Макей агучыў пажаданне беларускага боку, каб пры выпрацоўцы сваіх рэкамендацый МВФ улічваў нацыянальныя асаблівасці сацыяльна арыентаванай беларускай эканомікі. Беларускі бок выказаў гатоўнасць да інтэнсіфікацыі супрацоўніцтва з МВФ, падкрэсліўшы значнасць такога ўзаемадзеяння ў геапалітычным плане. Беларусь таксама пацвердзіла сваю зацікаўленасць у атрыманні рэкамендацый МВФ.

У БЕЛАРУСІ 9,66 МЛН ЖЫХАРОЎ

Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, на пачатак жніўня колькасць насельніцтва Беларусі — 9,66 мільёна чалавек. Гэта на 12,9 тыс. менш, чым у такі ж час летась.

У Брэсцкай вобласці цяпер 1,43 млн жыхароў, у Віцебскай — 1,26 млн, Гомельскай — 1,46 млн, Гродзенскай — 1,1 млн, Мінскай — 1,44 млн, Магілёўскай — 1,11 млн, у г. Мінску — 1,83 млн. Павелічэнне колькасці насельніцтва адбылося толькі ў сталіцы — на 25,1 тыс. чалавек.

Сёлета за сем месяцаў нарадзілася 63,7 тысячы дзяцей (на 2 тыс. больш, чым за адпаведны перыяд летась). Аднак па-ранейшаму даволі высокай застаецца смяротнасць — памерла 79,7 тыс. чалавек. Сярод станоўчых навінаў — павелічэнне зарэгістраваных шлюбаў (на 8,6 %) і змяншэнне разводаў (на 5,6 %). Адметна, што міграцыйны прырост за гэты час склаў 7 тыс. чалавек: у Беларусь прыехала 11,2 тыс., а выехала 4,2 тыс.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

БЫЛЫ ІНСПЕКТАР МЫТНІ «ЗАХОДНІ БУГ» АСУДЖАНЫ ЗА АТРЫМАННЕ І ДАЧУ ХАБАРУ

Толькі за адзін дзень работнік мытні прапусціў праз мяжу без афармлення дакументаў больш за 20 чалавек.

Гэта стварыла ўмовы для ўвозу ў нашу краіну з Польшчы без выплаты мытных плацяжоў тавараў для камерцыйнай дзейнасці пад выглядам тавараў для асабістага карыстання. За свае дзеянні інспектар атрымаў хабар ад двух чалавек у памеры 10 долараў і 10 тысяч рублёў. Раней за аналагічныя дзеянні ён атрымліваў хабар у памеры 20 долараў. Мужчына сам чатыры разы даваў хабар (па 30 долараў кожны раз) начальніку аддзела, у якім працаваў, — за патуранне пры выкананні ім службовых абавязкаў. Паводле слоў старшага памочніка пракурора Брэсцкай вобласці Вольгі ДЗМІТРУК, былога інспектара прыгаварылі да 5 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці.

Надзея ДРЫЛА.

УПАЛА КАБІНА, УПАЎ ПАМІЖ ВАГОНАМІ — А ВЫНІК АДЗІН...

Адразу дзвюма трагедыямі адзначана мінулая субота ў ваколіцах Брэста. На вуліцы лейтэнанта Рабцава абласнога цэнтра вадзіцель прыватнага ААТ рамантаваў матор аўтапагрузчыка. У гэты час на чалавека ўпала кабіна таго самага агрэгата. Мужчына 1966 года нараджэння, жыхар вёскі Відамля Камянецкага раёна, загінуў.

А ў вёсцы Чыжэўшчына Жабінкаўскага раёна ў гэты ж час у сваім доме памёр сцэпшчык вагонаў мясцовага торфапрадпрыемства 1959 года нараджэння — упаў паміж вагонамі. Чаму ён адразу не звярнуўся па медыцынскую дапамогу, зараз высвятляе пракуратура.

Яна СВЕТАВА.

Антыкрызісная эканоміка

Аляксандр МІКША, намеснік старшыні ФПБ:

«Удалося захаваць усе асноўныя сацыяльныя гарантыі работнікаў»

Скарачэнне аб'ёмаў вытворчасці, павелічэнне складскіх запасаў прадукцыі, змяншэнне прыбыткаў прадпрыемстваў — у складанай сітуацыі сёлета апынулася большасць суб'ектаў гаспадарання. Аднак, на думку спецыялістаў, Беларусь выбрала найбольш прадукцыйны шлях пераадолення цяжкасцяў у эканоміцы. Ці не пацярпелі працоўныя і сацыяльна-эканамічныя інтарэсы работнікаў, якім чынам мяркуецца вырашаць гэтую праблему ў наступным? На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Аляксандр МІКША.

«Масавых скарачэнняў не будзе»

— Мы надаём вялікую ўвагу кантролю за становішчам, якое складваецца на прадпрыемствах пад уплывам сусветнага фінансавага крызісу, — адзначае Аляксандр Сяргеевіч. — Рэгулярна праводзіцца грунтоўны маніторынг сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, штомесяц падводзяцца вынікі такіх даследаванняў, якія паведамляюцца ва Урад. Адпаведныя праблемы разглядаюцца на пасяджэннях Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях. Адразу заўважу: пазіцыя ў нас з сацыяльнымі партнёрамі адна — захаваць калектывы, максімальна не дапусціць змяншэння ўзроўню аплаты працы.

— Наколькі эфектыўна гэта робіцца?

— Масавых скарачэнняў у Беларусі не адбылося і не адбудзецца надалей. Усе перамяшчэнні работнікаў на рынку працы адбываліся ў звычайным рэжыме. Узровень беспрацоўя застаўся такім жа, якім быў у адпаведны перыяд год таму, — на канец ліпеня гэты паказчык складаў 0,9 працэнта эканамічна актыўнага насельніцтва. Ці можаце назваць хоць адзін такі прыклад у суседніх краінах? Але мы ніколькі не ідэалізуем сітуацыі, не будзем хваваць — становішча даволі складанае. Сёлета ў студзені — чэрвені 258,8 тысячы работнікаў працавалі ў рэжыме няпоўнай занятасці. Гэта значна больш, чым за такі ж перыяд летась. З аднаго боку — негатыўная тэндэнцыя, аднак з іншага — яна сведчыць пра тое, што людзі не страцілі працоўнага месца, не згубілі свайго сацыяльнага статусу. Зразумела, цяжка, аднак прасцей за ўсё было б звольніць работнікаў і ліквідаваць вытворчасць. А што далей? Крызіс жа не вечны — гэта трэба дакладна разумець. Зараз ні ў якім разе нельга дапусціць скарачэння працоўных месцаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Рэха прыёмнай кампаніі

Анатоль РУБІНАЎ:

«Выпускнікі сельскіх школ дагналі гараджан па ўзроўні падрыхтоўкі»

Панічныя заявы аб звышскладанасці паступлення ў ВНУ, звязаныя з быццам бы падвоеным выпускам школьнікаў і неканкурэнтаздольнасцю вучняў 11-х штрых-класаў, на практыцы не спраўдзіліся. Пра гэта на прэс-канферэнцыі, прысвечанай падвядзенню вынікаў уступнай кампаніі, заявіў журналістам старшыня Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Анатоль РУБІНАЎ.

Па-першае, колькасць абітурыентаў, якія праходзілі тэсціраванне, сёлета нават крыху зменшылася ў параўнанні з папярэднім годам. А па-другое, параўнальны аналіз вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання не выявіў істотнай розніцы ва ўзроўні падрыхтоўкі вучняў 11-х і 11-х штрых-класаў. У гэтым годзе вынікі цэнтралізаванага тэсціравання выраслі па вучэбных прадметах у сярэднім на 10 балаў. Пры гэтым размеркаванне тэставых балаў па ўсіх вучэбных прадметах прыкладна паўтарае вынікі абітурыентаў папярэдняга года. Адносна нізкія вынікі абітурыенты прадэманстравалі на іспытах па фізіцы, дзе каля 70 працэнтаў абітурыентаў набралі 20 балаў і менш, а таксама па матэматыцы, дзе 20 балаў і менш набралі 58 працэнтаў удзельнікаў тэставых іспытаў.

Пазітыўнай тэндэнцыяй можна лічыць той факт, што выпускнікі сельскіх школ па выніках цэнтралізаванага тэсціравання зусім нязначна адстаюць ад гараджан. Розніца ў сярэдніх балах складае ад 0,9 да 6 балаў, у залежнасці ад прадмета, **а па геаграфіі выхаванцы сельскіх школ нават маюць невялікую перавагу перад вучнямі гарадскіх навучальных устаноў (у 2 балы).** Гэта, па меркаванні Анатоля Рубінава, сведчыць у першую чаргу аб павышэнні якасці падрыхтоўкі ў сельскіх школах і выраўноўванні стартавых магчымасцяў абітурыентаў з гарадоў і сельскай мясцовасці.

Падчас сёлетняй прыёмнай кампаніі ў дзяржкамісію паступілі 259 вусных і 25 пісьмовых зваротаў ад грамадзян. Пераважная колькасць зваротаў мела кансультацыйны характар. Як і ў папярэднія гады, шэраг зваротаў грамадзян быў звязаны з адсутнасцю магчымасці ў абітурыентаў азнаёміцца са сваімі тэставымі работамі. «Усе скаргі, а таксама спрэчныя пытанні, не ўрэгуляваныя нарматыўнымі прававымі дакументамі, калегіяльна абмяркоўваліся ў дзяржаўнай камісіі, і па іх прымаліся рашэнні, якія максімальна ўлічвалі інтарэсы абітурыентаў. Прасцей кажучы, яны вырашаліся на карысць маладых людзей», — запэўніў Анатоль Рубінаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У КАНДАГАРЫ ЗАГІНУЎ 41 ЧАЛАВЕК

У афганскім горадзе Кандагар позна ўвечары 25 жніўня адбыўся тэракт.

У выніку загінуў як мінімум 41 чалавек і былі параненыя больш за 60. Усе ахвяры тэракта — цывільныя асобы, сярод загінулых ёсць дзеці. Выбух адбыўся на вуліцы каля офіса японскай фірмы, якая плануе пабудаваць дарогу праз тэрыторыю, якую кантралюе рух Талібан.

ЛІВАНЕЦ КУПІЎ ВУЛІЦУ ЗА 1000 ЕЎРА

Ліванскі перакладчык Васім Сааб з Берліна з-за промаху ўладаў мястэчка Хавельзее, усяго за 1000 еўра набыў вуліцу ў гэтым населеным пункце, размешчаным у федэральнай зямлі Брандэнбург.

Забудоўшчык доўгі час прапаноўваў мясцовым уладам купіць вуліцу разам з сістэмамі ірыгацыі і каналізацыі за сімвалічную суму ў адзін еўра. Аднак муніцыпалітэт пашкадаваў сродкі на натарыяльнае афармленне здзелкі. Пасля таго як забудоўшчык абанкруціўся, вуліцу вырашана было выставіць на аўкцыён усё за той жа кошт — адзін еўра. Улады разлічвалі самі выкупіць вуліцу. Аднак аб правядзенні аўкцыёну з інтэрнэту даведаўся берлінец Васім Сааб, які прыехаў на таргі і прапанаваў за лот 1000 еўра. Мясцовая чыноўніца, якая была другім удзельнікам аўкцыёну, прынесла з сабой толькі адзін еўра і не змагла перабіць кошт, прапанаваны Саабам. Эксперты, апытаныя газетай, лічаць, што рэальны кошт вуліцы можа дасягаць 500 тысяч еўра.

У ІТАЛІІ АБВЕШЧАНА «ПАЛЯВАННЕ» НА ШЧАСЛІЎЧЫКА

Да пошукаў уладальніка рэкорднага выйгрышу ў латарэю SuperEnalotto, які склаў 147,8 мільёна еўра, далучыліся тысячы людзей па ўсёй Італіі — ад адвакатаў і маці-адзіночак да знакамітай калабрыйскай мафіі.

Вядома, што шчаслівы квіток быў набыты ў бары мястэчка Баньёне ў рэгіёне Таскана. Усё яго насельніцтва складае каля двух тысяч чалавек, аднак асобу шчасліўчыка пакуль так і не атрымалася вызначыць. Адзін з «падазроных», бармэн Вані Сіманеці, у чыёй установе і быў прададзены за 2 еўра шчаслівы квіток, заявіў, што на яго адрас прыйшлі ўжо сотні лістоў, тэлефон бара не змаўкае ад званкоў журналістаў і адвакатаў, аднак усё гэта, удакладніў ён, робіцца памылкова. У прэсе з'явіліся чуткі, што за ўладальнікам выйгрышу пачалі паляванне мафіёзі — яны патрабуюць адступных у памеры 30 % ад выйгрышу.

ВЫРАСЦІЛІ — ЯК ЗАХАВАЦЬ?

Другі хлеб

Летнія месяцы для бульбаводаў сталі сапраўдным выпрабаваннем. Як захаваць тое, што вырасла? Раіць загадчык аддзела аховы бульбы РУП «Нацыянальна-практычнага цэнтра НАН Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве» кандыдат сельскагаспадарчых навук Віталь КАЛАЧ.

— З-за моцнага развіцця фітафтарозу на бульбоўніку многія клубні былі заражаныя ўзбуджальнікамі гэтай хваробы, — гаворыць Віталь Іосіфавіч. — Там, дзе не праводзіліся ахоўныя мерапрыемствы, асабліва ў прыватным сектары, дажджы змылі ў глебу вялізную колькасць інфекцыі. Чаргаванне моцных ападкаў і цёплага надвор'я спрavакавала з'яўленне гніляў. У асобных выпадках на пераўвільготненых глебах бульба задыхаецца. Усё гэта адмоўна адаб'ецца на захоўванні клубняў і можа прывесці да стратаў. Але гэтага можна і трэба пазбегнуць. А менавіта: перад уборкай зараз праводзіць рыхленне глебы паміж радкамі, можна механізавана, а калі гэта некалькі сотак, тут спрацуюць ручныя культыватары, усе падручныя сродкі — матыкі, садовыя вілы і інш. Гэтым разбураецца скарынка глебы, выводзіцца залішняя вільгаць, бульба атрымлівае больш кіслароду, лепш дыхае. Трэба скасіць або зжаць бульбоўнік, калі ён яшчэ захаваўся, і праз 12—14 дзён пачынаць уборку, старацца капаць у сонечнае надвор'е, прасушваць, старанна праводзіць пераборку.

Закладку бульбы на захоўванне рэкамендуецца праводзіць паэтапна. У лячэбны перыяд пасля ўборкі неабходна кожны дзень на градус зніжаць тэмпературу да градусаў 15, больш праветрываць. Потым ідзе перыяд ахаладжэння, калі зніжаецца тэмпература з 15 да 8 градусаў і, нарэшце, асноўны перыяд захоўвання. Аптымальнай тэмпературай для захоўвання бульбы лічыцца тэмпература ў 4—6 градусаў. Перш за ўсё трэба правільна падрыхтаваць месцы для захоўвання бульбы. Склепы, скрынкі, засекі павінны быць сухімі, чыстымі, пабеленымі вапнай. Пры неабходнасці іх можна апрацаваць 2-працэнтным растворам кухоннай солі. Для абеззаражвання памяшкання рэкамендуецца выкарыстаць дымавую заслону з палыну горкага ці піжмы (на працягу 24 гадзін). Пасля апрацоўкі памяшканне добра праветрываюць. Калі закладваць у бурты, то абавязкова захоўваць тэхналогію закладкі: павінны быць паветраадводы, засыпаць адразу пяском (5—10 см), потым — слой саломы 30—40 см і 30 см шчыльнай зямлі. З надыходам халадоў уцяпліць пілавіннем, сухім лісцем, торфам або падсыпаць зямлі.

У час захоўвання ў памяшканнях верхні слой бульбы пацее. У гэтым выпадку яго накрываюць рыхлай саломай, матамі, якія пасля ўвільгатнення замяняюць. Вельмі добра накрываць клубні драўніннай стружкай або зверху бульбы насыпаць сталовыя буракі. Стружка не патрабуе прасушвання, а буракі не баяцца павышанай вільготнасці. Некаторыя гаспадары стараюцца апрацаваць клубні драўнінным попелам, мелам, даламітавай мукой, нават цэментам (ёсць у літаратуры і такая рэкамендацыя).

Трэба правесці асенняе азеляненне бульбы, якая пойдзе на насенне ў наступным годзе. Бульба, якая прайшла азеляненне, закладваецца асобна ад харчовай: калі не ў асобным памяшканні, то ў склепе павінен быць асобны засек для насеннай бульбы, каб не браць у ежу азеляненую бульбу, у якой прысутнічае ядавітае рэчыва саланін.

— З назіранняў вучоных інстытута, якія гатункі бульбы сёлета менш пацярпелі ад фітафторы?

— Як правіла, да фітафтарозу больш устойлівыя гатункі з групы позніх і сярэдняпозніх. Гэта Атлант, Здабытак, Сузор'е, Брыганціна, Ветразь. З ранняй групы добра паказаў сябе гатунак Лілея.

— А як паводзіў сябе гатунак Журавінка, які падабаецца многім?

— У Журавінкі сярэдняя ўстойлівасць. Гэты год быў спрыяльным для развіцця фітафтарозу ва ўсіх абласцях, таму больш за 50 працэнтаў насадак бульбы гатунку Журавінка было пашкоджана інфекцыяй.

Ёсць мясціны добрыя для праветрывання, ахаваныя лесам, аддаленыя, дзе назіралася меншае пашкоджанне бульбы фітафторай. Хто хоць раз-два апрацаваў насадкі ядахімікатамі, праводзіў агратэхнічныя прыёмы, той будзе з бульбай, цяпер жа застаецца правільна захоўваць ураджай.

Падрыхтавала Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.08.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 821,00
▲ 1 еўра	4 041,08
1 латвійскі лат	5 758,91
1 літоўскі літ	1 170,37
1 чэшская крона	159,35
1 польскі злоты	989,04
▲ 1 расійскі рубель	89,84
1 украінская грыўня	339,88

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	31,4007
UAH	37,9007
1000 BYR	11,0996
EUR	44,9407

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Славакія выступае за зніжэнне кошту шэнгенскіх візаў для беларусаў

Аб гэтым заявіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Славацкай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Мар'ян Серватка, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Як пасол у Славацкай Рэспубліцы я выступаю за зніжэнне гэтага тарыфу амаль напалову пры захаванні стандартаў шэнгенскай зоны. Славакія будзе падтрымліваць зніжэнне кошту візаў для беларусаў. Аднак з гэтым павінны згадзіцца ўсе краіны ЕС», — адзначыў дыпламат. Паводле яго слоў, сённяшні кошт візы 60 еўра для звычайнага грамадзяніна высокі. Яго зніжэнне «было б падарункам і прывітаннем грамадзянам Беларусі ад ЕС», лічыць ён.

Штогод Славакію наведваюць каля 8 тыс. беларусаў. Як адзначыў Мар'ян Серватка, пасольства стараецца зрабіць усё магчымае, каб у краіне маглі пабываць больш грамадзян Беларусі. Ён паведаміў, што ў мінулым годзе пасольства выдала 1,2 тыс. бясплатных візаў дзецям, якія накіроўваліся ў Славакію на аздараўленне, а таксама студэнтам і выкладчыкам, мастакам, спартсменам, вучоным, журналістам, музыкантам. У гэтым годзе было адкрыта 800 бясплатных візаў.

І для настаўнікаў «школьная форма»?

Міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў скептычна ставіцца да ідэі ўвядзення адзінай формы адзення для беларускіх настаўнікаў, якую на поўным сур'ёзе абмяркоўваюць некаторыя беларускія дэпутаты.

Парламентарыі, якія цяпер вядуць работу над праектам Кодэкса аб адукацыі, напэўна, вырашылі, што будзе несправядлівым кантраляваць знешні выгляд школьнікаў і не звяртаць увагі на тое, у чым ходзяць на вучэбныя заняткі педагогі.

«Адзіная форма адзення для настаўнікаў і сапраўды практыкавалася ў царскай Расіі. Аднак, на мой погляд, строгі дзелавы стыль у адзенні педагогаў павінен быць, але апранаць усіх настаўнікаў у адзіную форму зусім неабавязкова», — паведаміў на сустрэчы з журналістамі Аляксандр Радзькоў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Беларускі шоу-бізнэс: хто больш нахрапісты, той і ўварве

«Хто больш нахрапісты, той і ўварве» — так адазваўся пра беларускі шоу-бізнэс кіраўнік заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Нацыянальнага канцэртнага аркестра Міхаіл Фінберг, адказваючы на пытанне, чаму ў рэспубліцы мала артыстаў, якія збіраюць поўныя залы, і чаго не хапае айчынным зоркам.

Міхаіл Фінберг адзначыў, што большасць спевакоў пяюць «пад фанеру». Нават на ўрадавых мерапрыемствах, такіх як «Дажынкі», «Славянскі базар», кульгае якасць канцэртаў. «Няма рэжысёраў, няма навізны, няма навацый. Але час патрабуе новых падыходаў! Мы ўжо не носім чырвоныя гальштукі, у нас іншая краіна, а падыходы старыя. Вось і атрымліваецца, што шоу-бізнэс — гэта хто больш нахрапісты, той і ўварве. І гэта праблема характэрна не толькі для Беларусі. У Расіі яна яшчэ больш актуальная, але там ёсць канкурэнцыя, а ў нас яе няма», — лічыць маэстра.

Кар. БЕЛТА.

Алкагольныя напіткі і цыгарэты ў Беларусі можна будзе прадаваць на рынках

Урад Беларусі дазволіў продаж алкагольных напіткаў і цыгарэт на рынках. Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 1102 ад 24 жніўня гэтага года, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Апараце Савета Міністраў.

Каментуючы дакумент, ва ўпраўленні гандлю Мінгандлю паведамілі, што рашэннем урада ўнесены змяненні ў дзеючыя правілы гандлю. Так, «дазволена рэалізацыя алкагольных напіткаў і тытунёвых вырабаў у магазінах, аб'ектах грамадскага харчавання, размешчаных на тэрыторыі рынкаў незалежна ад іх прыналежнасці», адзначылі ў міністэрстве. Гэта дасць магчымасць пашырыць тавараправодную сетку і павялічыць тавараабарот. Пастанова ўступае ў сілу праз тры месяцы пасля афіцыйнага апублікавання.

Начальнік цэха краў металапракат на мільёны

Супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі ў стратэгічных кірунках УУС Мінскай вобласці затрымалі начальніка цэха аднаго са структурных падраздзяленняў Міністэрства энергетыкі — ААТ «Цэнтрэнергамантаж» за крадзеж. Пра гэта паведаміла супрацоўнік прэс-службы УУС Мінскай вобласці Марына ЭВЕРСМАН.

Кіраўнік меў шырокія паўнамоцтвы па цэлым шэрагу найважнейшых вытворчых пытанняў. У прыватнасці, ён адказваў за ўвесь цыкл вытворчасці металаканструкцый для такіх стратэгічна важных аб'ектаў, як, напрыклад, цепласеткі. Карыстаючыся гэтым, 46-гадовы мужчына спісваў металапракат шляхам складання фальшывых актаў і пасля за паўцаны збываў яго розным камерцыйным структурам.

У дзень, калі супрацоўнікамі абласной міліцыі зламыснік быў узяты з доказамі віны, ён спрабаваў прадаць амаль 10 тон дзяржаўнай сыравіны. Адна толькі гэта крымінальная здзелка магла нанесці прадпрыемству ўрон амаль на Br20 млн. Затрыманы абвінавачваецца як мінімум у дзясятку такіх фактаў.

У ходзе вобыску па месцы жыхарства затрыманага аператыўнікамі было знойдзена і канфіскавана $12 тыс. 700.

Начальніку цэха прад'яўлена абвінавачанне па частцы 3 артыкула 210 КК РБ («Крадзеж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі»), якім прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці.

Кар. БЕЛТА.

«ВЫПУСКНІКІ СЕЛЬСКІХ ШКОЛ ДАГНАЛІ ГАРАДЖАН ПА ЎЗРОЎНІ ПАДРЫХТОЎКІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Заклапочанасць у членаў дзяржкамісіі выклікае значнае пашырэнне сёлета прыёму на завочную форму навучання ў ВНУ: калі ў 2008 годзе на завочную форму было залічана каля 34 працэнтаў ад усяго набору, то сёлета гэта лічба ўзрасла да 44 працэнтаў. *Наўрад ці такое рэзкае пашырэнне завочнай формы навучання з'яўляецца апраўданым, тым больш, што яно практычна цалкам рэалізуецца за кошт пашырэння платнай завочнай адукацыі.*

Дзверы прыёмных камісій зачыніліся перад абітурыентамі ў апошні дзень у 18 гадзін, аднак прыёмныя камісіі былі вымушаны працаваць да глыбокай ночы, каб прыняць дакументы ва ўсіх, хто паспеў раўнікамі ВНУ неаднойчы ўносіліся карэктывы ў кантрольныя лічбы прыёму абітурыентаў ужо пасля 1 красавіка, што не прадугледжана правіламі прыёму. А ў Мінскім інстытуце кіравання кантрольныя лічбы змяняліся ажно чатыры разы і павялічыліся за тры месяцы з 2100 да 2876 чалавек. І толькі пасля другой заўвагі з боку Міністэрства адукацыі там зноў вярнулася да першапачатковай лічбы — 2100 чалавек. Вось толькі зроблена гэта было ў апошні дзень падачы дакументаў, прычым пасля 15 гадзін. Такія дзеянні рэктара фактычна пазбавілі многіх абітурыентаў магчымасці паступлення ў іншыя ВНУ і, натуральна, справакавалі скаргі іх бацькоў.

У Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі ў парушэнне Палажэння аб прыёмнай камісіі былі створаны дзве прыёмныя камісіі, адну з якіх узначаліў рэктар, а другую — дэкан педагагічнага факультэта ў Магілёве. У Брэсцкім дзяржаўным каледжы чыгуначнага транспарту прыём на завочную форму навучання па спецыяльнасці «тэхналагічная сувязь на чыгуначным транспарце» ажыццяўляўся ў адпаведнасці з сярэднім балам дакумента аб адукацыі, у той час як павінен быў праводзіцца конкурсны адбор на падставе вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання. Гэта ўпушчэнне кіраўніцтва Беларускай чыгункі, у ведамстве якой знаходзіцца гэты каледж.

Анатоль Рубінаў канстатаваў, што ні адзін год не абыходзіцца без выяўлення поўных правапарушэнняў і злоўжыванняў з боку службовых асобаў, якія, праўда ніяк не могуць уплываць на справядлівасць сістэмы адбору і разлічаны, хутчэй, на людзей, якія працягваюць наіўна верыць, што ў ВНУ можна трапіць, так бы мовіць з «чорнага ўваходу», а ў сістэме засталіся яшчэ нейкія пралазы. Так, напярэдадні ўступных іспытаў выкладчык кафедры англійскай мовы БДЭУ папярэджанні, як і рэдактар газеты і начальнік абласнога ўпраўлення гандлю і паслуг — за парушэнні заканадаўства аб рэкламе.

Анатоль Рубінаў падкрэсліў, што дзяржаўнай камісіяй быў выяўлены шэраг праблемных момантаў, якія патрабуюць нарматыўнага ўрэгулявання. Напрыклад, гэта датычыцца некаторых нормаў прафесійнага адбору абітурыентаў. Як вядома, для паступлення на асобныя спецыяльнасці неабходна яшчэ вясной прайсці прафесійную гутарку. Але ў Акадэміі МУС замест гутаркі праводзіцца свой так званы прафесійны адбор. Некаторыя з абітурыентаў, якія паступалі ў гэту акадэмію на спецыяльнасць «правазнаўства» і прайшлі прафадбор, не змаглі пазней прайсці там па конкурсе. Тэарэтычна яны маглі б паспрабаваць паступіць на «правазнаўства» ў іншую ВНУ, але ім было адмоўлена на той падставе, што яны праходзілі «не тую гутарку».

Яшчэ адна праблема звязана з неўрэгуляванасцю правілаў падачы дакументаў у творчыя ВНУ і ССНУ на платныя месцы. Прычына ў тым, што для паступлення ў творчыя навучальныя ўстановы абітурыенты спачатку падаюць заявы, а толькі потым здаюць экзамены, прычым менавіта ў той навучальнай установе, куды былі пададзены дакументы. Аднак тыя, хто не прайшоў па конкурсе на бюджэтныя месцы, могуць забраць вынікі сваіх экзаменаў і падаць іх на платныя месцы ў іншую ўстанову адукацыі на аналагічную ці роднасную спецыяльнасць. Аднак узровень патрабаванняў на экзаменах можа істотна адрознівацца ў розных навучальных установах і па працягласці, і па методыцы правядзення экзамену. Такім чынам высокія балы, атрыманыя ў больш «лёгкай» ССНУ, даюць абітурыентам неапраўданыя перавагі пры паступленні на платную форму навучання ва ўстановах з больш высокімі патрабаваннямі да абітурыентаў. Многіх такі парадак не задавальняе.

Дарэчы, вынікі правядзення эксперыменту ў Акадэміі музыкі і Акадэміі мастацтваў, дзе, згодна з Указам Прэзідэнта, былі ўведзены новыя правілы прыёму, будуць падведзены да 1 кастрычніка. «Я асабіста наведваў экзамены па творчасці і быў прыемна ўражаны тым, якая ў нас таленавітая моладзь. Таму адказна заяўляю, што ніякіх трывожных фактаў у правядзенні ўступных іспытаў у творчых ВНУ выяўлена не было», — дадаў Анатоль Рубінаў.

Разам з тым, распаўсюджваць эксперымент і на творчыя спецыяльнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў ў найбліжэйшы час не плануецца. Як патлумачыў Анатоль Рубінаў, калі ў Акадэміі музыкі і Акадэміі мастацтваў рыхтуюць выключна творчую ці музычную эліту, і план набору там мінімальны, то ва ўніверсітэце культуры вядзецца падрыхтоўка кадраў з педагагічным ухілам. А для будучых педагогаў значэнне мае не толькі іх талент, але і ўзровень іх агульнай падрыхтоўкі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДАВЕДКА

У ЦТ узялі ўдзел каля 175 тысяч чалавек, з іх выпускнікоў папярэдніх гадоў — 58 тысяч чалавек (33,2 працэнта ад агульнай колькасці).

Абсалютны вынік (100 балаў) маюць: па беларускай мове — 122 абітурыенты, па матэматыцы — 22, рускай мове — 30, біялогіі — 15, хіміі — 4, фізіцы — 2, англійскай мове — 1. Усяго 206 стабальных вынікаў (у 2008 годзе — 77).

У выпускніцы абласнога ліцэя № 3 г. Магілёва Кацярыны Якубёнак і выпускніцы СШ № 8 г. Віцебска Таццяны Дзятлоўскай — два 100-бальныя вынікі: па беларускай мове і біялогіі. А Кацярына Якубёнак атрымала яшчэ і 98 балаў на ЦТ па хіміі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

На слыху

НЕ ЎДАЛОСЯ ПАДЗАРАБІЦЬ

Шматмільённы крадзеж і перапродаж запасных частак да збожжаўборачнай і сельскагаспадарчай тэхнікі прадухілілі ў Рагачоўскім раёне супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі і карупцыяй мясцовага РАУС. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі.

З аператыўных крыніц міліцыянерам стала вядома, што група асобаў актыўна шукае пакупнікоў на новыя, як меркавалася, скрадзеныя запчасткі да трактароў і камбайнаў. Меркаванымі пакупнікамі дэфіцытных запчастак былі камерсанты з Украіны. Каб устанавіць службовых асобаў КСУП, якія мелі дачыненне да крадзяжоў, затрыманне прадпрымальнікаў з Украіны правялі супрацоўнікі Быхаўскага РАУС Магілёўскай вобласці. Аднак пастаўшчыкі зноў заняліся пошукамі патэнцыяльных пакупнікоў.

Толькі пасля адгрузкі чарговай партыі запчастак і грашовага разліку супрацоўнікі міліцыі правялі затрыманне. Папярэдняя сума скрадзенага вар'іруецца ад Br5 млн да Br6 млн.

У выніку праверкі, якую цяпер праводзіць гандлёва-прамысловая палата сумесна з кантрольна-рэвізійным упраўленнем Мінфіна і спецыялістамі аблсельгасхарча, абавязкова будуць выяўлены новыя эпізоды злачыннай дзейнасці арганізаванай групы. У прыватнасці, адзначылі ў МУС, ужо сёння можна казаць аб наяўнасці на складах няўлічаных запчастак да сельгастэхнікі. Хутчэй за ўсё, сума ўрону ўзрасце ў разы.

РАЗГЛЯД ЗВАРОТАЎ ГРАМАДЗЯН І ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ У ПАДАТКОВЫХ ОРГАНАХ

Работа падатковых органаў па зваротах грамадзян будуецца сістэмна па наступных асноўных кірунках:

— прыём грамадзян і іх папярэдняе кансультаванне;

— разгляд пісьмовых зваротаў, што паступаюць, і падрыхтоўка адказаў на іх:

— арганізацыя работы па заявачным прынцыпе «адно акно».

Работа па прыёме грамадзян, у тым ліку па пытаннях выдачы даведак, арганізавана такім чынам, каб не дапускаць чэргаў, працяглага чакання прыёму.

У мэтах эканоміі часу грамадзян падатковыя органы ажыццяўляюць папярэдні запіс на прыём як пры непасрэднай яўцы грамадзяніна ў інспекцыю Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь (далей — інспекцыя МПЗ), так і па тэлефоне. Пры змяненні па аб'ектыўных прычынах узгодненага тэрміну прыёму грамадзяне паведамляюць пра гэта.

У цэнтральным апараце Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь і ў інспекцыях МПЗ вызначаны канкрэтныя, найбольш дасведчаныя работнікі, якія ажыццяўляюць папярэдняе кансультаванне грамадзян па пытаннях, што іх цікавяць. У інспекцыях МПЗ створаны аддзелы кансультацый, куды плацельшчыкі, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, могуць звярнуцца на працягу працоўнага дня па пытаннях прымянення падатковага заканадаўства.

Інфармацыя аб даце, часе і месцы правядзення асабістага прыёму, аб парадку ажыццяўлення папярэдняга запісу, аб правядзенні папярэдняга кансультавання размяшчаецца ў агульнадаступных месцах на інфармацыйных стэндах інспекцый МПЗ, а таксама на афіцыйным сайце Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь, у тым ліку на рэгіянальных старонках сайта Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

Законам аб зваротах грамадзян вызначаны пэўныя правілы асабістага прыёму, якія датычацца абавязкаў грамадзян, а менавіта: пры вусным звароце грамадзянін павінен паказаць дакумент, які сведчыць яго асобу.

Артыкулам 4 Закона аб зваротах грамадзян замацавана права грамадзян звярнуцца ў дзяржаўны орган, іншую арганізацыю (да службовай асобы) асабіста або праз свайго прадстаўніка.

Абараняць інтарэсы грамадзян у падатковых органах могуць як законныя, так і ўпаўнаважаныя прадстаўнікі. Законнымі прадстаўнікамі няпоўнагадовых ва ўзросце да 14 гадоў з'яўляюцца іх бацькі, усынавіцелі або апекуны; непаўналетніх ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў — іх бацькі, усынавіцелі або папячыцелі. Законным прадстаўніком грамадзяніна, прызнанага недзеяздольным па прычыне псіхічнага расстройства, з'яўляецца апякун. Законным прадстаўніком грамадзяніна, які абмежаваны судом у дзеяздольнасці па прычыне злоўжывання спіртнымі напоямі, наркатычнымі сродкамі або псіхатропнымі рэчывамі, з-за чаго ён ставіць сваю сям'ю ў цяжкае матэрыяльнае становішча, згодна з артыкулам 30 ГК, з'яўляецца папячыцель.

Пры вусным звароце прадстаўнік грамадзяніна павінен прад'явіць дакумент, які сведчыць яго асобу, а таксама дакумент, які пацвярджае паўнамоцтвы. Такімі дакументамі, напрыклад, могуць быць рашэнне суда, пасведчанне апекуна (папячыцеля), даверанасць і г.д.

У выпадку калі пытанне, выкладзенае ў вусным звароце, не можа быць вырашана ў час прыёму, зварот можа выкладацца грамадзянінам (яро прадстаўніком) у пісьмовай форме і падлягае разгляду ў вызначаным парадку. Звароты грамадзян, якія паступаюць у падатковыя органы, падлягаюць рэгістрацыі і абавязковаму разгляду.

Пісьмовыя звароты грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, павінны ўтрымліваць:

— найменне і (або) адрас падатковага органа, куды накіроўваецца зварот;

— прозвішча, імя, імя па бацьку грамадзяніна, звесткі аб яго месцы жыхарства і (або) працы (вучобы);

— выкладзеную сутнасць звароту (прапановы, заявы, скаргі);

— асабісты подпіс грамадзяніна.

Да пісьмовых зваротаў дадаюцца дакументы, што пацвярджаюць паўнамоцтвы асобаў, якія звяртаюцца ад імя іншых грамадзян. Практыка паказвае, што ў падатковыя органы грамадзяне, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, звяртаюцца з заявай аб растлумачэнні падатковага заканадаўства, заканадаўства аб прадпрымальніцтве або са скаргай на прынятыя падатковым органам рашэнні ці на дзеянні (бяздзеянне) іх службовых асобаў.

Пытанні, вырашэнне якіх не ўваходзіць у кампетэнцыю падатковых органаў, накіроўваюцца па прыналежнасці ў іншыя органы дзяржаўнага кіравання на месцы або ў мясцовыя органы выканаўчай улады і кіравання ў пяцідзённы тэрмін з дня іх рэгістрацыі з адначасовым паведамленнем аб гэтым аўтару звароту.

Артыкулам 10 Закона аб зваротах грамадзян вызначаны канкрэтныя **тэрміны разгляду звароту.** Зварот павінен быць разгледжаны не пазней за адзін месяц з дня яго паступлення, а калі не патрабуецца дадатковага вывучэння і праверкі пытання, то не пазней за 15 дзён. Пры неабходнасці дадатковага вывучэння і праверкі тэрмін разгляду звароту можа быць працягнуты, але не больш чым на адзін месяц. Тэрмін разгляду звароту пры неабходнасці накіравання запытаў у замежныя дзяржавы і (або) міжнародныя арганізацыі можа быць працягнуты да шасці месяцаў. Такія тэрміны разгляду звароту вылічваюцца з дня рэгістрацыі звароту у дзяржаўных органах, іншых арганізацыях.

Як правіла, звароты грамадзян лічацца вырашанымі, калі выкладзеныя ў іх пытанні разгледжаныя і па іх прынятыя належныя меры па абароне, забеспячэнні рэалізацыі, аднаўленні правоў і законных інтарэсаў аўтара звароту, дадзеныя адказы заяўнікам. Рашэнне, прынятае па звароце, можа быць абскарджана ў вышэйшы орган, вышэйшую арганізацыю або суд у парадку, вызначаным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Пры гэтым дзейным заканадаўствам дадзена права пакідаць без разгляду па сутнасці пісьмовыя звароты, калі:

— зварот не адпавядае патрабаванням, вызначаным у Законе да афармлення звароту, у тым ліку і да іх зместу;

— у зваротах утрымліваюцца нецэнзурныя або абразлівыя словы ці выразы;

— тэкст звароту не паддаецца прачытанню;

— звароты падлягаюць разгляду толькі ў парадку канстытуцыйнага, крымінальнага, грамадзянскага, гаспадарчага судаводства, вядзення спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях, а таксама ў іншым парадку, вызначаным заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Пры пакіданні звароту без разгляду па сутнасці і пры наяўнасці звестак аб месцы жыхарства грамадзяніна падатковы орган у пяцідзённы тэрмін з дня рэгістрацыі звароту пісьмова паведамляе аўтару аб прычынах пакідання звароту без разгляду па сутнасці і вяртае яму арыгіналы дакументаў, дадзеных да звароту, а ў выпадку калі зварот падлягае разгляду толькі ў парадку канстытуцыйнага, крымінальнага, грамадзянскага, гаспадарчага судаводства, вядзення спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях, а таксама ў іншым парадку, тлумачыць, у якую арганізацыю і ў якім парадку трэба звярнуцца для вырашэння выкладзеных у звароце пытанняў. Звароты, якія ўтрымліваюць інфармацыю аб злачынстве, што рыхтуецца, учыняецца або ўчынена, або іншым правапарушэнні, у пяцідзённы тэрмін з дня іх рэгістрацыі накіроўваюцца ў адпаведныя праваахоўныя або іншыя дзяржаўныя органы.

Сутнасць заявачнага прынцыпу «адно акно» заключаецца ў тым, што грамадзянін, індывідуальны прадпрымальнік павінен звярнуцца толькі ў адзін дзяржаўны орган ці арганізацыю і падаць тыя дакументы аб зместы, якія могуць быць пададзены толькі ім. Усе іншыя дакументы і звесткі, што маюцца ў іншых дзяржаўных органах, павінен запрасіць орган, які ажыццяўляе адміністрацыйную працэдуру.

Асноўнае новаўвядзенне **Закона аб адміністрацыйных працэдурах** заключаецца ў тым, што з 12 мая 2009 г. не могуць ажыццяўляцца адміністрацыйныя працэдуры, не прадугледжаныя заканадаўчымі актамі або пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Адміністрацыйныя працэдуры ажыццяўляюцца падатковымі органамі на падставе пісьмовай або вуснай заявы фізічнай асобы.

У пісьмовай заяве павінны быць пазначаны назва падатковага органа, куды падаецца заява; прозвішча, імя, імя па бацьку, месца жыхарства, уліковы нумар плацельшчыка, назва дзяржаўнага органа, іншай дзяржаўнай арганізацыі, якія ажыццяўляюць дзяржаўную рэгістрацыю, дата і нумар рашэння аб дзяржаўнай рэгістрацыі, рэгістрацыйны нумар у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асобаў і індывідуальных прадпрымальнікаў — для індывідуальнага прадпрымальніка; назва адміністрацыйнай працэдуры, па ажыццяўленне якой ён звяртаецца; дакументы і (або) звесткі (пры іх наяўнасці), якія падаюцца разам з заявай. Гэта заява падпісваецца грамадзянінам ці яго прадстаўніком.

Артыкулам 17 Закона аб адміністрацыйных працэдурах вызначаны **падставы для адмаўлення ў прыняцці заявы,** а менавіта: калі не пададзены дакументы і (ці) іншыя звесткі, уключаныя ў пералік дакументаў і (ці) звестак, якія падаюцца зацікаўленымі асобамі, а таксама калі не пададзены дакументы, што сведчаць асобу, пацвярджаюць дзяржаўную рэгістрацыю індывідуальнага прадпрымальніка, пацвярджаюць паўнамоцтвы прадстаўніка зацікаўленай асобы. Акрамя таго, названым артыкулам Закона аб адміністрацыйных працэдурах дадзена права ўпаўнаважаному органу адмовіць у прыняцці письмовай заявы зацікаўленай асобы, калі не выкананы патрабаванні да формы ці зместу такой заявы.

Аб адмаўленні ў прыняцці заявы зацікаўленай асобы падатковы орган у трохдзённы тэрмін з дня падачы такой заявы прымае адміністрацыйнае рашэнне.

Калі такое адміністрацыйнае рашэнне прынятае ў вуснай форме ў ходзе прыёму грамадзяніна, яно падлягае абвяшчэнню яму, а ў іншых выпадках паведамленне аб прынятым адміністрацыйным рашэнні не пазней за пяць дзён з дня яго прыняцця выдаецца грамадзяніну (яго прадстаўніку) або накіроўваецца яму пасланцам (кур'ерам), па пошце, ці грамадзяніну паведамляецца аб прынятым рашэнні па тэлефоне ці іншым спосабам.

Аб адмаўленні ў ажыццяўленні адміністрацыйнай працэдуры, у тым ліку ў сувязі з вызначэннем немагчымасці пацвярджэння адпаведнага факта або пазначэння адпаведных звестак (напрыклад, звестак аб даходах у сувязі з іх адсутнасцю ў падатковым органе), падатковы орган у тэрміны, вызначаныя для ажыццяўлення адміністрацыйнай працэдуры, прымае адміністрацыйнае рашэнне, якое не пазней за пяць дзён з дня прыняцця выдаецца грамадзяніну (яго прадстаўніку) або накіроўваецца яму пасланцам (кур'ерам), па пошце, або ў пазначаны тэрмін грамадзяніну паведамляецца аб прынятым адміністрацыйным рашэнні па тэлефоне або іншым спосабам.

Аб факце паведамлення службовай асобай падатковага органа робіцца адзнака на адваротным баку заявы ці робіцца запіс у журнале рэгістрацыі заяў аб ажыццяўленні адміністрацыйных працэдур.

Работа са зваротамі грамадзян, якая праводзіцца падатковымі органамі, дазваляе больш аператыўна выявіць хібы дзейнага заканадаўства і абазначыць праблемы, што патрабуюць заканадаўчага ўрэгулявання.

Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.

Абзац

◢ Першыя «Дажынкі-2009» у Мінскай вобласці справілі ўчора ў Нясвіжскім раёне. Свята прайшло на базе СВК «17 Верасня», які атрымаў самую высокую ўраджайнасць у сталічным рэгіёне — 65,9 ц/га.

◢ У Віцебску пенсіянер расстраляў на вуліцы чалавека. 74-гадовы мужчына з незарэгістраванай паляўнічай стрэльбы «ІЖ-12» 12-га калібру ў спрэчцы забіў 63-гадовага мясцовага жыхара. Падазроны затрыманы, стрэльба канфіскаваная, вядзецца следства.

◢ Супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці выявілі склад боепрыпасаў у Акцябрскім раёне. Выяўлена 30 выбухованебяспечных прадметаў, агульная вага ў тратылавым эквіваленце — 36 кг. Схрон знаходзіўся ў непасрэднай блізкасці да жылых пабудоў. Сапёры выявілі таксама непадалёк ад склада мінамётныя міны і гранаты часоў вайны.

◢ У выніку ДТЗ на тэрыторыі Лепельскага раёна загінулі мужчына і жанчына; іх сын, які кіраваў аўтамабілем, дастаўлены ў бальніцу. Мінчанін не справіўся з кіраваннем «Таётай» і сутыкнуўся з магістральным цягачом.

◢ Амерыканскія навукоўцы прапануюць выкарыстоўваць кавуны для вытворчасці біяпаліва. Як сцвярджаюць даследчыкі, сок гэтай расліны можа стаць важнай крыніцай біяпаліва, якім спрабуюць замяніць бензін дзеля зніжэння выкідаў у атмасферу. На думку навукоўцаў, на гэтыя мэты можна выкарыстоўваць тыя 20 % кавуной, якія штогод застаюцца ў полі з-за касметычных дэфектаў: пашкоджання паверхні ці няправільнай формы. Падлікі паказалі, што з 1 га бахчы можна атрымаць 200 л этанолу.

Поўны абзац

◢ Нямецкая фірма, што выпускае жаночую бялізну, зрабіла сапраўдны падарунак нямецкім мужчынам, выпусціўшы ў продаж бікіні, якія маюць уласцівасць знікаць пасля ўзаемадзеяння з вадой, перадаюць брытанскія СМІ. Незвычайны касцюм пад назвай Get Naked з'явіўся на прылаўках крамаў зусім нядаўна і паспеў выклікаць захапленне з боку мужчын і столькі ж абурэння з боку прыгожай паловы чалавецтва. Рэч, што выглядае як звычайны купальны касцюм са станіка і трусікаў-тангаў, цалкам раствараецца ў вадзе на працягу некалькіх секундаў. Скандальнае вынаходніцтва прывяло ў шаленства прадстаўнікоў абароны правоў жанчын. Яны лічаць, што такі купальнік зневажае іх годнасць.

◢ Выцягванне валасамі — вельмі папулярны від спорту ў Кітаі. Аднак дагэтуль ім займаліся выключна мужчыны. І калі нехта бачыў кітайца з выдраным клокам валасоў, то разумеў: гэта спартсмен-няўдачнік. Зараз да мужчынскай лігі валасацягаў далучылася і жанчына. Кітаянка 50 м цягнула 6 легкавых аўтамабіляў, прывязаўшы іх да сваёй касы, і паставіла тым самым рэкорд як першая прадстаўніца слабага полу ў гэтым нясцюдным відзе спорту. Некаторыя жартуюць: было б няблага прымяніць такую практыку і ў нас: захрасла твая машына на дрэннай дарозе, а бліжэйшы трактар — за 10 км. Ідзеш да валасацяга і за ўмераную плату дамаўляешся...

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Мы едзем, едзем, едзем...

Расклад скарэктавалі рамонтныя работы

27 жніўня здымаюцца з руху электрацягнікі: Мінск, Інстытут культуры — Стоўбцы адпраўленнем у 14.39 і Стоўбцы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем у 11.46.

Толькі 31 жніўня не будуць курсіраваць электрычкі Мінск-Пасажырскі — Маладзечна адпраўленнем у 12.40 і Маладзечна — Мінск адпраўленнем у 12.46. З 1 па 4 верасня ўключна электрацягнік Мінск-Пасажырскі — Асіповічы адпраўленнем у 13.17 прызначаецца на маршрут Мінск — Рудзенск, а Асіповічы — Мінск адпраўленнем у 13.33 у гэтыя ж дні ў рух Рудзенск — Мінск. 2 верасня ў раскладзе, акрамя вышэйназваных змяненняў, будуць жыўна наступныя. Не будуць курсіраваць электрацягнікі: Мінск-Пасажырскі — Маладзечна адпраўленнем у 13.34; Маладзечна — Мінск адпраўленнем у 13.50; Мінск, Інстытут культуры — Стоўбцы адпраўленнем у 14.39; Стоўбцы — Мінск, Інстытут культуры адпраўленнем у 10.43; Мінск, Інстытут культуры — Барысаў адпраўленнем у 8.35; Барысаў — Мінск-Усходні адпраўленнем у 10.17. У гэты ж дзень, 2 верасня, прызначаюцца электрычкі: Баранавічы — Мінск, Інстытут культуры адпраўленнем у 8.17 — на маршрут Баранавічы — Мінск-Пасажырскі; Мінск, Інстытут культуры — Баранавічы — Брэст адпраўленнем у 11.54 — на маршрут Мінск-Пасажырскі — Баранавічы — Брэст (адпраўленнем з Мінска-Пасажырскага ў 12.00); Мінск, Інстытут культуры — Баранавічы адпраўленнем у 13.56 пойдзе па маршруце Мінск-Пасажырскі — Баранавічы (адпраўленнем з Мінска-Пасажырскага ў 14.00).

Падоўжаны маршруты руху

З 28 жніўня падаўжаецца маршрут руху электрацягнікоў на ўчастку Мінск — Маладзечна — Мінск па пятніцах і нядзелях.

Электрычка Мінск — Аляхновічы адпраўленнем са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 17.58 прызначаецца на маршрут Мінск — Уша. Да станцыі Аляхновічы яна будзе ісці згодна з дзейным раскладам, адпраўленне са станцыі Аляхновічы ў 19.16, прыбыццё на прыпыначны пункт Баяры ў 19.22, Ласі — у 19.26, прыбыццё на станцыю Уша ў 19.31.

Электрацягнік Аляхновічы — Мінск адпраўленнем са станцыі Аляхновічы ў 20.05 будзе курсіраваць па маршруце Уша — Мінск. Адпраўленне са станцыі Уша ў 19.47, прыбыццё на прыпыначны пункт Баяры ў 19.54, Ласі — у 19.59, на станцыю Аляхновічы ў 20.05, далей згодна з дзейным раскладам, прыбыццё на станцыю Мінск-Пасажырскі ў 21.14. Даведкі па тэлефонах: 105, 225 70 00.

Прызначэнне цягнікоў адбілася на раскладзе

УП «Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі» праінфармавала пасажыраў пра змяненні ў раскладзе руху на ўчастку Мінск — Маладзечна — Мінск у сувязі з прызначэннем паскораных электрацягнікоў.

Так, цягнік № 6137 Мінск-Пасажырскі — Маладзечна будзе курсіраваць з 28 жніўня па пятніцах. Адпраўленне са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 18.28, прыпыначны пункт Радыятарны 18.33 —18.35, Масюкоўшчына — 18.38 —18.39, Лебядзіны — 18.41 —18.43, станцыя Ждановічы — 18.46 —18.47, Ратамка — 18.52 —18.53, Крыжоўка — 18.56, Беларусь — 19.02 —19.03, Радашковічы — 19.09 —19.10, Дубравы — 19.17 —19.18, Аляхновічы —19.23 — 19.24, Уша — 19.37 — 19.38, прыпыначны пункт Фестывальны — 19.49 — 19.50, прыбыццё на станцыю Маладзечна — 19.54, у астатнія дні тыдня — згодна з дзейным раскладам.

Цягнік № 6142 Маладзечна — Мінск-Пасажырскі з 30 жніўня будзе хадзіць па нядзелях. Адпраўленне са станцыі Маладзечна ў 19.53, прыпыначны пункт Фестывальны — 19.58 —19.59, Татаршчызна — 20.06 — 20.07, станцыя Уша — 20.12 — 20.13, Аляхновічы — 20.25 — 20.26, Дубравы — 20.32 — 20.33, Радашковічы — 20.39 — 20.49, Беларусь — 20.46 — 20.48, Крыжоўка — 20.54, Ратамка — 20.57 — 20.58, Ждановічы — 21.02 — 21.03, прыпыначны пункт Масюкоўшчына — 21.08 — 21.09, Радыятарны — 21.12 — 21.13, прыбыццё на станцыю Мінск-Пасажырскі ў 21.20, у астатнія дні тыдня — згодна з дзейным раскладам.

Новы рэйс на Смаленск. Са зніжкамі

**З 23 жніўня па серадах і нядзелях адкрываецца рух аўтобусаў ў

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «КОРОЛЕВСКОЕ РОЖДЕСТВО»

1. Настоящая рекламная игра называется **«Королевское Рождество»**, проводится в соответствии с условиями настоящих правил с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников игры дополнительной платы (далее по тексту – «Игра»).

Игра имеет цель – дополнительное увеличение посетителей (клиентов) казино «Royal», город Минск, проспект Независимости, 11, корп. 1.

2. Организатором Игры является ООО «Дакарай», расположенное по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр.Независимости, 11/2-610. Учетный номер плательщика 190617507. Свидетельство № 614 о государственной регистрации коммерческой организации выдано Мингорисполкомом 18 апреля 2005 г. (далее по тексту – «Организатор»).

3. Игра проводится в казино «Royal» по адресу: Республика Беларусь, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 11, корп. 1 в период с **01 сентября 2009 года по 24 декабря 2009 года** (включительно).

4. Призовой фонд Игры.

Призовой фонд Игры формируется в полном объеме за счет чистой прибыли Организатора Игры – ООО «Дакарай». Призом Игры является автомобиль **Мерседес-Бенц ML 280 CDI 4MATIC** стоимостью **172 122 980** (сто семьдесят два миллиона сто двадцать две тысячи девятьсот восемьдесят) белорусских рублей.

5. В Игре в период ее проведения могут принять участие совершеннолетние физические лица в возрасте старше 18 лет (далее по тексту «Участники»), с учетом ограничений, изложенных в настоящих Правилах.

В Игре не имеют права участвовать работники и представители Организатора Игры, работники предприятий, связанных с Организатором договорными отношениями (обслуживающих Игру), а также члены семей названных работников и представителей, работники и представители любых других юридических лиц, имеющих отношение к организации и/или проведению настоящей Игры, а также члены их семей.

6. Описание Игры.

Механизм проведения Игры:

• Для того чтобы принять участие в Игре и розыгрыше призов, Участнику следует в период с **01 сентября 2009 года по 24 декабря 2009 года** посетить казино «Royal», расположенное по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1, и принять участие в играх «ПОКЕР» стол № 1 и/или «РУЛЕТКА» стол № 1 и/или «БЛЭК ДЖЭК» стол № 1. Нумерация столов указана на столах.

При этом участнику игры «ПОКЕР» независимо от игры у «дилера» выдаются игровые купоны при условии, если Участник Игры сделал ставку, на которую выпала комбинация согласно таблице:

комбинация/ ставка	10 у.е. – 25 у.е.	30 у.е. – 55 у.е.	60 у.е. – 95 у.е.	100 у.е. – 300 у.е.	>300 у.е.
«Стрит»	–	1	2	4	6
«Флэш»	–	2	4	6	8
«Фул Хауз»	2	3	5	8	10
«Карэ»	4	5	10	15	20
«Стрит флэш»	5	10	20	25	30
«Роял флэш»	10	20	30	50	70

Участнику игры «БЛЭК ДЖЭК» выдаются игровые купоны при условии ставки и за выпадение комбинаций согласно таблице:

комбинация/ ставка	10 у.е. – 25 у.е.	30 у.е. – 55 у.е.	60 у.е. – 95 у.е.	100 у.е. – 245 у.е.	250 у.е. – 300 у.е.
«7», «7» или «Блэк Джэк»	–	–	–	–	1
«Блэк Джэк одной масти»	–	1	2	4	6
«6», «7», «8» или «7», «7», «7» разной масти	2	4	6	8	10
«6», «7», «8» или «7», «7», «7» одной масти	4	6	8	10	20

Участнику игры «РУЛЕТКА» выдаются игровые купоны при условии выплаты при выпадении номера на столе согласно таблице:

номер/ выплата	200 у.е. – 500 у.е.	501 у.е. – 1000 у.е.	1001 у.е. – 5000 у.е.	5001 у.е. – 10 000 у.е.	>10 000 у.е.
номер равный числу дня	1	2	3	5	7
при повторе выпадения номера (один за другим)	1	2	3	5	7

Также игроку игры «РУЛЕТКА» выдаются купоны при выплате сумм согласно таблице, кроме выплат со ставок на дюжины, колонки, большие и малые номера, четные и нечетные номера, красные и черные номера:

выплата	500 у.е. – 1000 у.е.	1001 у.е. – 5000 у.е.	5001 у.е. – 10 000 у.е.	>10 000 у.е.
количество купонов	1	2	3	5

Стоимость у.е. (условной единицы) – 2 830 белорусских рублей.

Купоны выдаются в период проведения рекламной игры с **23 час. 00 мин. 01 сентября 2009 года до 21 час. 00 мин. 24 декабря 2009 года.**

Каждый купон состоит из двух частей, имеющих свой идентификационный номер.

Участник Игры, получивший купон, по линии отрыва разделяет купон на две половины, одну половину оставляет себе, вторую – возвращает сотруднику Организатора Игры. Переданные Организатору Игры купоны регистрируются с указанием имени и первой буквы фамилии. В лототрон помещаются купоны игроков, набравших 10 и более купонов.

Получение купона Участником Игры подтверждает факт ознакомления и полное согласие Участника с Правилами Игры, выражает желание Участника участвовать в Игре, а также обязывает лично присутствовать при проведении розыгрыша призового фонда Игры.

Организатор имеет право проводить дополнительные экспертизы купонов Участников Игры, в том числе с привлечением экспертов. Поддельные купоны Участника Игры к участию в Игре не допускаются. Идентификация купонов Участника Игры осуществляется работниками Организатора Игры.

7. В рамках Игры создается комиссия по проведению рекламной игры. Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения рекламной игры с 01 сентября 2009 года по 24 декабря 2009 года.

Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной игры:

• Персональный состав комиссии утверждается приказом директора ООО «ДАКАРАЙ». В состав комиссии входят 3 человека – председатель и два члена комиссии.

• Решение комиссии признается действительным при условии присутствия большинства членов из общего состава комиссии.

• Член комиссии ведет протокол заседаний комиссии.

• В протоколе розыгрыша призового фонда отражается время и место проведения розыгрыша призового фонда, сведения о составе комиссии по проведению розыгрыша, действия комиссии по проведению розыгрыша в том порядке, в каком они совершались, результаты проведения розыгрыша с указанием выигравшего купона и сведений о победителе, обладателе Приза рекламной игры.

• Протокол подписывают все члены комиссии, присутствующие при проведении заседания комиссии.

• Протокол заседания комиссии по проведению розыгрыша приза рекламной игры является основанием для выдачи приза победителю.

• Комиссия уполномочена рассматривать жалобы и предложения со стороны участников Игры.

8. **Розыгрыш приза** Игры состоится по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, казино «Royal» в присутствии комиссии по проведению рекламной игры и участников игры **24 декабря 2009 года в 23.00.**

Все зарегистрированные и допущенные к участию в розыгрыше купоны Участника Игры помещаются представителем Организатора в лототрон и перемешиваются. Один из членов комиссии случайным образом вытягивает купоны Участника Игры из лототрона, объявляется идентификационный номер купона. Если в зале отсутствует владелец второй части купона с данным идентификационным номером, то из лототрона вынимается следующий купон. Данная процедура повторяется до тех пор, пока не будет вытянут купон с идентификационным номером, совпадающим с номером купона присутствующего в зале Участника Игры. Таким образом определяются 37 Участников Игры. Далее Игра проводится на игровом столе «Американская рулетка». Купон игрока, который был определен для участия первым, помещается на игровое поле «Американской рулетки» на номер «0». Купон игрока, который был определен вторым, помещается на игровое поле «Американская рулетка» на номер «1». Таким образом заполняются номера от «0» до «36». Крупье запускает шарик рулетки. Игрок, чей купон находится на выпавшем номере, является первым финалистом. На освободившийся номер на столе «Американская рулетка» один из членов комиссии вытягивает из лототрона купон. Крупье снова запускает шарик. Процедура повторяется до тех пор, пока не определятся еще два финалиста. После этого трем финалистам выдаются три игрушечные машинки «Мерседес». Машинки помещаются игроками на игровом поле «Американская рулетка» на номер «0». Финалисты бросают игральную кость в той очередности, в которой выходили в финал. Сколько точек выпадает на игральной кости, на столько номеров игрок передвигает свою машинку. Победителем становится тот финалист, который первым доведет свою машинку до номера «36» игрового стола, даже если у кого-то из остальных финалистов осталась возможность сделать еще бросок. Финалист-победитель получает приз – автомобиль, указанный в пункте 4 настоящих Правил.

9. По итогам розыгрыша составляется и подписывается членами комиссии протокол розыгрыша. Решение комиссии, касающееся результата розыгрыша Призового фонда, является окончательным и обязательным для всех Участников и не может быть изменено.

10. О рекламной игре можно получить информацию, позвонив по телефону «горячей линии» (8029)1113333 ежедневно с 09.00 до 24.00, либо непосредственно в казино «Royal» по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1.

11. Вручение приза игры будет осуществляться по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр. Независимости, 11, корп. 1, казино «Royal» в срок до **31 декабря 2009 года.**

12. Для получения приза выигравшему Участнику Игры необходимо иметь при себе паспорт, удостоверяющий личность, и вторую половину игрового купона для сверки его идентификационного номера с номером выигрышного купона.

Если Победитель Игры лично не явится за получением приза по адресу, указанному в п. 11 настоящих Правил, Победитель лишается права на получение приза.

Если победителем становится лицо, признанное недееспособным или ограниченно дееспособным, право получения приза переходит к его законным представителям.

13. Победитель Игры несет ответственность за уплату всех применимых налогов и предоставление налоговой отчетности, установленных действующим законодательством Республики Беларусь, связанных с получением призов Игры.

14. Организатор не оплачивает Участнику Игры расходы, связанные с проездом к месту получения приза Игры.

15. Приз не подлежит замене, выплата денежного эквивалента стоимости приза не осуществляется.

Ответственность Организатора по выдаче приза ограничивается исключительно указанном в настоящих Правилах количеству и виду приза. Организатор Игры не несет ответственность за любые риски, связанные с повреждением приза и его эксплуатацией, возникшие после выдачи приза победителю.

Факт участия в Игре подразумевает, что ее Участники соглашаются с тем, что в рамках рекламной игры их имена, фамилии, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Участники Игры по их согласию могут давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

16. Информирование о проведении Игры и ее условиях производится посредством размещения рекламы в средствах массовой информации, с использованием средств наружной рекламы, выпуском полиграфической продукции.

Настоящие Правила, сведения о Призовом фонде игры и порядке его формирования, сведения о составе комиссии по проведению рекламной игры и регламенте ее работы подлежат публикации в средствах массовой информации до начала рекламной игры.

Информация о результатах розыгрыша Призового фонда Игры будет опубликована не позднее 10 января 2010 года в том же СМИ, где будут опубликованы правила настоящей Игры.

Дополнительно информация может быть размещена в других средствах массовой информации.

17. Участие в Игре автоматически подразумевает ознакомление с настоящими Правилами и согласие Участников Игры следовать всем условиям настоящих Правил. Несоблюдение Участником выполнения настоящих Правил считается его отказом от участия в Игре.

Председатель:

• Лесков Сергей Александрович (Место работы – ООО «Дакарай», должность – начальник смены).

Члены комиссии:

• Чеславская Ольга Геннадьевна (Место работы – ООО «Дакарай», должность – заместитель начальника смены);

• Герко Андрей Александрович (Место работы – ООО «Дакарай», должность – заместитель начальника смены).

Комиссия будет осуществлять свою деятельность в период проведения рекламной игры с **01 сентября 2009 года по 24 декабря 2009 года** (включительно).

Свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры выдано Министерством торговли Республики Беларусь за № 1517 от 25.08.2009 года. УНП 190617507.



З'яўленне чалавека на гэтак званай Партызанскай вуліцы Асінторфа — з'ява рэдкая.

Гэткая адзнака стаіць у пашпартах колішніх тарфянікаў.

АСІНТОРФ. 10-ы ПАСЁЛАК...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стр.)

Лёс Ганны самы тыповы. Замуж пайшла за гэткага ж, як сама, тарфяніка Якава. Якаў нарадзіўся ў Аршанскім раёне, але пасля дэмабілізацыі з арміі працаваць у калгас не пайшоў, бо «не было чаго есці». Яго завербавалі ў Асінторф. Ды і пашпарт нарэшце з'явіўся ў хлопца. У зімовы час пасёлкі пусцелі, людзі з заробкамі вярталіся на радзіму. А Якаў з Ганнаю ўтварылі сям'ю, пабудавалі свой дом і перасталі быць «гапкамі». Якаў стаў лесніком і больш у тарфянікі не вярнуўся, а Ганна засталася, займаючыся ў міжсезонне нарыхтоўкаю ягад і грыбоў.

Таццяна Якушэнка нарадзілася ў Лёзненскім раёне, а ў 10-м яна з 1945 года. Прыехала без бацькоў. Была на штабялёўцы, працавала на канавах, на разліве, гэта калі стаіш па пах у балоце з торфапомпай (быў такі спосаб вырабу торфу). Цяпер, як і ўсе, мучыцца з нагамі, спінаю. Як і Якаў Шкрэдаў, Таццяна стала лесніком, адпрацавала ў лесе 22 гады. Агульны ж стаж яе — 45 гадоў.

Многія пасёлкі ўжо не існуюць. Напрыклад, чацвёрты, пяты, шосты, дзявяты. А тыя, што засталіся, лічацца не самастойнымі населенымі пунктамі, а вуліцамі рабочага пасёлка Асінторф. Пасёлак № 10 знаходзіцца за восем кіламетраў ад Асінторфа, але лічыцца Партызанскай вуліцай. Пасёлак № 8 — вуліца Лясная. Толькі Пасёлак № 2 мае шыльды на ўездзе і выездзе, што ён Пасёлак №2. Магчыма, лёс дзясятага не быў бы гэткі сумны, як сёння, калі б не процьма аб'ектыўных абставінаў.



Якаў ШКРЭДАЎ яшчэ спраўны гаспадар на сваёй зямлі.

Па-першае, спыненне здабычы торфу — бо выкапні не бясконцыя. Па-другое — адсутнасць іншых месцаў працы. Па-трэцяе — аддаленасць. Патрапіць у вёску можна толькі праз Аршанскі раён. І хоць паміж суседняй вёскай Верацея кіламетр з хвосцікам, аршанскія дарожнікі праклалі дарогу толькі да свайго населенага пункта. Гэта лагічна, але толькі з пункту гледжання аршанскіх ведамстваў. «Зімою дарогу чысцяць да могілак у вёсцы Халмы, — жаляцца апошнія жыхары Дзясятага і пытаюцца: А мы што, не людзі? Нам і святло на вуліцы не трэба? Дровы нам прапануюць толькі дарагія, даражэйшыя за нашыя пенсіі». Сапраўды, нават аўтобус у Дзясяты пасёлак не ходзіць. Аршанскаму раёну гэта не баліць, а Дубровенскаму — немэтазгодна. А калі «хуткую дапамогу» трэба выклікаць, якія бываюць праблемы! Што ні кажы, а сітуацыя ў пасёлка склалася сапраўды шыварат-навыварат. Цяпер торфаздабыўнае прадпрыемства Асінторфа належыць Белдрэсу Аршанскага раёна. Сам жа Асінторф належыць Дубровенскаму. Вось і атрымліваецца, што Пасёлак № 10 з яго пенсіянерамі наогул нікому не патрэбны, хоць у ім жывуць яшчэ дзесяць чалавек. Усе гэтыя людзі мелі самае непасрэднае дачыненне і да беларускай энергетыкі, і паліўнай прамысловасці. Ці памятаюць пра іх у гэтых ведамствах?

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Праверана на сабе

ВЫРУЧКА — 20 ТЫСЯЧ

На сталічным «Полі цудаў» спрабавала пагандляваць карэспандэнт «Звязды» Настасся ЗАНЬКО

Тут гандлююць усім. Вайсковай формай, манетамі, зубачысткамі, партыйнымі пасведчаннямі, маткамі дроту... Нават вулічныя ліхтары і тыя прадаюць. Што за людзі пакупнікі і гандляры барахолкі, чытайце ніжэй.

«Я З ШАСЦІ РАНКУ ЗАЙМАЛА!»

Да «Поля цудаў», а менавіта так народ называе барахолку ў Ждановічах, я дабралася ў 10 гадзін ранку. Па мерках бараholкі, гэта вельмі позна. Сюды прыязджаюць на досвітку, каб заняць найбольш выгаднае месца. Шукаючы, дзе б раскласці свой тавар, прайшла амаль усю тэрыторыю.

Каля жанчыны з дзіцячым адзеннем бялеў незаняты лапік пяску. Я памкнулася да яго, але была спыненая ваяўнічай бабуляй з іншага шэрагу.

— Куды?! Занята! Я тут з шасці ранку займала! Зараз прыйдзе сяброўка, — бабуля правяла мяне злосным позіркам.

Шэрагі ў цэнтры былі настолькі шчыльнымі, што яблыку няма дзе ўпасці. Паблукаўшы яшчэ колькі часу, натрапіла на адзінае незанятае месца за пяць метраў ад грамадскай прыбіральні. Смурод ад яе ішоў страшэнны.

З месцам мне дапамог Лёня, мужчына гадоў пяцідзесяці. Ён гандлюе каля прыбіральні старымі веласіпеднымі шынамі, тэлефоннымі апаратамі, жалезнымі сітамі і інш. Смуглявы дзябёлы мужчына з абшарпаным загарэлым тварам у выразках раней белых нагавіцах і футбольнай чырвона-сіняй майцы расказвае мне, што сам родам з-пад Магілёва. Жонка яго кінула, нягледзячы на тое, што «каталася, як сыр у масле. А на развод прыйшла «абарванкай», каб грошай больш адсудзілі.

— Я сваю дзяўчынку хачу паставіць, — падсоўвае няголенага мужчыну з гайкамі і шлангамі ён. — Няхай стаіць тут вось, якраз месца насупраць мяне. Раскладвайся, раскладвайся, што не варушышся?

Рассцілаю жоўтую цырату, прыкладваю каменьчыкамі. Выкладваю кнігі Францыазы Саган, маладой беларускай паэткі Вікі Трэнас, такога ж маладога і беларускага Арцёма Кавалеўскага, аўдыё-кнігі Экзюперы, Лесі Украінкі, старую зламаную лямпу, не менш стары дыктафон, альбом, ношаныя майкі, беларускія газеты, заяву на выдачу шэнгенскай візы, нумар дома з Гародні і г.д. Усё, што было непатрэбнае ў мяне і маіх сябровак, прывезла сюды.

На мяне насцярожана, моўчкі глядзяць няголены тоўсты сусед справа, які са сваімі гайкамі займае метраў восем і сіваваты вусаты дзядуля з махавікамі злева.

— Калі ты ўжо за мяне замуж выйдзеш? — нечакана пытаецца Лёня. — Я мужык на зайздрасць. Выйдзеш за мяне замуж — будзеш, як за сцяной. На барахолку цябе не пушчу. Сам усім забяспечваць буду. Вунь учора семдзесят тысяч зарабіў. Падумай, падумай.

Агледзеўшы газеты, Лёня папрасіў пачытаць што-небудзь для душы. Прапаноўваю «Турызм і адпачынак», ён адмоўна матае галавой.

— «Давай «Звязду», — кажа ён і адыходзіць на сваё месца.

ЯК ПРАДАЦЬ?

Разбежкі ў коштах на барахолцы вялікія. Хтосьці прадае дыскі за 5000, а нехта за 1500. На любы кошт, па словах Лёні, знойдзецца пакупнік. Я вырашыла гандляваць па прынцыпе «а колькі не шкада», праверым, як будуць сябе паводзіць пакупнікі.

Да маёй цыраты спачатку падыходзяць далёкія і блізкія суседзі-гандляры і прафесійным вокам ацэньваюць мой тавар.

— Не прыставай да маёй дзяўчыны, — падбягае, махаючы пальцам перад носам бялявага мужчыны ў чырвонай майцы, Лёня.

— Ды я проста гляджу, — агрызаецца той.

— Вазьміце фільм «Сакратарка», — прапаноўваю я.

— А за колькі? — загараюцца вочы ў мужчыны.

— А колькі не шкада? — правяраю яго.

— Ну. Так не пойдзе. Што значыцца «не шкада»? Колькі? — настойвае ён.

— Чатыры тысячы, — першае, што прыйшло ў галаву, кажу я.

— Дарагавата... — мнецца мужчына, пасля махае рукой: — Ай, трэба ж даць маладой зарабіць. Бяру.

Лёня перажываў, каб я не заніжала кошты і не засталася ў мінусе.

— Ты што! Як гэта «колькі не шкада», дык так і зусім не заробіш, — навучаў мяне ён. — Вунь дыск, які ты прадала, пятак, не меней, каштаваў. Ты ж думай!

СКУПШЧЫКІ

Заглядзеўся на кнігі поўны мужчына ў камізэльцы з вялікай колькасцю кішэняў і скураной сумкай цераз плячо. Ён хутка разгледзеў увесь тавар, пакратаў альбом, пашчоўкаў кнопкамі дыктафона і сышоў.

— Гэта скупшчык, — пасля патлумачылі мне суседзі. — Тут такіх шмат. Ходзяць, аглядаюць, што дзе пачым, бывае, што калі шмат чаго ёсць ці нешта цікавае, то бяруць оптам.

Скупшчыкі на барахолцы самыя розныя. За той час, які я прастаяла, праз мяне прайшлі некалькі чалавек скупшчыкаў, як я пазней даведалася. Чарговага я ўжо змагла адрозніць. Скупшчык звычайна праглядае ўвесь тавар вельмі хутка, ён адразу заўважае трэшчынкі, няспраўнасці і г.д. Яму бессэнсоўна што-небудзь «уцюхваць». Ён сам падыдзе, калі будзе патрэбна. Скупшчыкі — выратаванне для людзей, якія не хочуць доўга стаяць на барахолцы. Ім можна адразу прадаць партыю і не стаяць на сонцы самому. Праўда, кошты ў іх будуць больш нізкімі.

Пакуль мы размаўлялі, да прыбіральні падышла жанчына з дзвюма торбамі і пакетам. Шырокія плечы і грубаваты голас выдавалі пастаянную фізічную працу, а роўны паўднёвы загар казаў пра нядаўні адпачынак.

— Дзяўчына, можна каля вас стаць? Усю барахолку абхадзіла і нідзе стаць не далі, — гучна крыкнула яна.

Я кіўнула. Жанчына, назавём яе Таццяна, пачала даставаць сінія, чорныя працоўныя касцюмы. Зусім новыя, яшчэ з біркамі, на адным з пінжакоў быў нават надпіс «Вентыляцыя».

— Ат, дамовілася са скупшчыкам, што ён у мяне оптам па 25 тысяч забярэ. Прывезла ўсё сюды, а ён як спецыяльна не прыехаў. Дык што цяпер, дадому везці? — патлумачыла яна.

Жанчына хуценька расклала ў дадатак да пінжакоў палатняныя рукавіцы, паношаныя чаравікі і басаножкі, выпрасталася, прынюхалася і зморшчылася.

— Ну і духі, ну і духі. Ой, як жа пахнуць буду. Хай бы ўжо дзе які іншы скупшчык прыйшоў ды аддала б па 25 тысяч, толькі дадому б не везці, — прабурчала яна.

ЗА МЕСЦА НА ПЯСКУ — 2 ТЫС., НА АСФАЛЬЦЕ — 180 ТЫС.

— Дзяўчына, за колькі дыктафон аддасі? — падышоў смуглявы дзядок у чырвоным кепі.

Дыктафон, шчыра кажучы, не працуе ўжо гадоў пяць. У яго адвальваецца крышка, зламаная кнопка, ды і ўнутры ён так заіржавеў, што, магчыма, ужо ніколі не запрацуе.

— Дваццаць тысяч, — успомніўшы, што гэта падарунак цёткі з Амерыкі, кажу я.

— Ой не, слухай, каб хоць за дзесяць, — скептычна круцячы дыктафон у руках, кажа дзядок. — Не, нават не за дзесяць, а за восем вазьму. Вельмі ж рызыкоўна. Я за рамонт шмат аддам.

Я пагаджаюся. Дзядуля купіў яшчэ і складанку за 1000 для ўнука.

— Тут кантралёры ходзяць, — прыжмурыўшыся, сказаў ён. — Ты ім за месца павінна будзеш плаціць. Колькі? Як дамовішся. Дзве, а то і тры тысячы.

Мой сусед справа расказаў, што гэта звычайна адміністрацыя рынку. Людзі збіраюць па дзве, а то і тры тысячы з «носа», калі не здаеш, то давядзецца пакінуць месца. Дзве-тры тысячы — гэта расцэнкі для гандлю «на пяску». Месца на асфальце будзе каштаваць 180 тысяч на два выхадныя. Таму на асфальце гандлююць, у асноўным, антыкварыятам.

— Ну, скажуць пакінуць, мы зробім выгляд, што сыходзім, а самі альбо застаёмся, альбо на новае месца пераходзім, — хітра ўсміхаецца сівы дзядуля.

Таццяна, пачуўшы пра расцэнкі за месца, пачынае абурацца:

— Авоечкі, за што тут плаціць? За пясок гэны? За месца каля прыбіральні? З гэтымі «духамі»! Я ж нічога не нагандлявала...

Гандаль у Таццяны і праўда не ішоў. Яна стаяла моўчкі, людзі гэтак жа моўчкі праходзілі, не спыняючыся.

— Гэта сэканд усё перабівае нам, — паглядзеўшы, што і мае майкі неяк не купляюць, знаходзіць тлумачэнне яна. — Вось ты мне скажы, навошта насіць адзенне з амерыканцаў, ці там яшчэ каго чужога, калі тут свайго хапае? У мяне ў дачкі два мяхі ўсялякага адзення назбіралася. Дык куды яго дзець? Сюды прывезці, але ці хто купіць? Ой, каб жа хоць што прадаць...

РОЎНА Ў ДЗВЕ ГАДЗІНЫ БАРАХОЛКА НАПАЛОВУ ПУСЦЕЕ...

Пакупнікі сыходзяць, за імі падцягваюцца і прадаўцы. Цэнтр, дзе ранкам было не прайсці, нагадвае лес з вялікімі прагаламі. Абяцаны кантралёр так і не прыйшоў.

— Ды рэдка ён сюды, да прыбіральні, даходзіць, — кажа сусед злева. — Добра, што цяпер толькі адзін раз у дзень ходзяць, а не два, як раней.

Бачачы, што гандлю ўжо не будзе, складваюся і я. За чатыры гадзіны прадала альбом, лямпу, дзве кнігі, ляльку, веер, складанку і дыск. Выручыла 20 тысяч.

У Таццяны сітуацыя крыху лепшая. Яна прадала ўсё ж адзін касцюм і дзесяць рукавіц.

— 43 тысячы зарабіла, — усміхаецца яна.

Лёня прызнаецца, што ўчора ён семдзесят тысяч «падняў». А сёння не яго дзень і гандлю добрага не было. Аднак яны з Таццянай вырашаюць застацца і яшчэ крыху «палавіць пакупніка».

Дайшоўшы да выхада, азіраюся і бачу вялікае, амаль пустое поле, памерам з два, а то і тры футбольныя. У цэнтры капошацца чалавек шэсцьдзясят. Да выхада стужачкай цягнуцца гандляры і гандляркі з клятчастымі сеткамі. Пустымі ці поўнымі, гэта каму як пашчасціла. Вецер носіць пакеты, шматкі паперы і пыл. «Поле цудаў» замірае да заўтрашняга ранку.

Грашовыя даходы насельніцтва ў студзені — чэрвені склалі Br41,4 трлн

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце, у параўнанні са студзенем — чэрвенем 2008 года гэты паказчык павялічыўся на 18,7 працэнта пры росце спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі за гэты перыяд на 14,6 працэнта.

У выніку рэальныя грашовыя даходы насельніцтва, скарэкціраваныя на індэкс спажывецкіх цэнаў, павялічыліся на 3,5 працэнта, рэальныя грашовыя даходы (за вылічэннем падаткаў і ўзносаў) — на 3,4 працэнта. У студзені — чэрвені гэтага года грашовыя даходы ў разліку на душу насельніцтва склалі Br713,4 тыс. у месяц. Яны павялічыліся ў параўнанні з аналагічным мінулагоднім перыядам у рэальным выражэнні на 3,7 працэнта.

Беларусь у I паўгоддзі скараціла экспарт прадуктаў харчавання на 9,6 працэнта, імпарт — на 22 працэнты

Беларусь у першым паўгоддзі гэтага года скараціла экспарт прадуктаў харчавання на 9,6 працэнта да $988,8 млн, а імпарт — на 22 працэнты да $753,9 млн, паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

Вартасны аб'ём экспарту ў першым паўгоддзі знізіўся ў выніку скарачэння экспартных паставак згушчанага і сухога малака (на $68,3 млн), рыбных кансерваў (на $28,1 млн), свініны (на $21,3 млн), сыроў і тварагу (на $15,1 млн), цукру (на $13,5 млн). Разам з тым істотна знізіўся імпарт свініны (на $36,1 млн), алеяў (на $31,7 млн), марожанай рыбы, уключаючы філе (на $21,1 млн). Менш сталі закупляць круп (на $17,9 млн), макаронных вырабаў (на $11,7 млн). Скараціўся імпарт свежых яблыкаў і груш (на $11,7 млн), безалкагольных напіткаў (на $11,2 млн), фруктовых і агародніннных сокаў (на $9,7 млн).

Больш за ўсё ў студзені — ліпені павялічыліся запасы цукру і круп

Па стане на 1 жніўня гэтага года запасы цукру-пяску на прамысловых прадпрыемствах Беларусі ў 3,7 раза перавысілі сярэднямесячны аб'ём вытворчасці, паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

У параўнанні з 1 жніўня 2008 года запасы цукру-пяску выраслі ў 1,9 раза да 151,5 тыс. тон. Запасы круп у 3,3 раза перавысілі сярэднямесячны аб'ём вытворчасці. Запасы кансерваў дасягнулі 125,5 млн умоўных бляшанак, што складае 268,7 працэнта да сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці. Акрамя таго, на складах вялікія запасы каньяку — 50 тыс. дал (239,7 працэнта да сярэднямесячнага аб'ёму вытворчасці), вінаградных вінаў — 265 тыс. дал (171 працэнт).

Нацбанк Беларусі ў студзені — ліпені прадаў насельніцтву 975 брыльянтаў

Нацыянальны банк Беларусі ў студзені — ліпені гэтага года прадаў насельніцтву 975 брыльянтаў агульнай масай 157,44 карата, паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі Нацбанка.

Выручка ад іх рэалізацыі склала каля Br611,2 млн, або $218,6 тыс. Усяго з пачатку рэалізацыі брыльянтаў Нацбанкам прададзена 5 597 штук агульнай масай 933,3 карата.

БЕЛТА.

Нацбанк увёў у абарачэнне манеты «Скарпіён»

Нацыянальны банк Беларусі 26 жніўня ўвёў у абарачэнне памятныя манеты «Скарпіён» серыі «Знакі Задыяка».

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі Нацбанка, манеты адчаканены двух відаў — срэбныя наміналам 20 беларускіх рублёў пробай сплаву 925 і медна-нікелевыя вартасцю 1 рубель. На аверсе манет у коле з 12 знакаў Задыяка адлюстраваны Сонца і Месяц, пад імі астралагічны знак скарпіёна і надпіс: на лацінскай мове SCORPIO і на беларускай СКАРПІЁН. На адваротным баку новых манет — стылізаваная выява скарпіёна ў абрамленні стылізаванага арнаменту, пры гэтым на срэбных манетах ёсць устаўкі з сінтэтычных крышталёў. Манеты адчаканеныя на Манетным дварэ Польшчы.

Андрэй ПЯТРОЎ. «Мінск—Навіны».

За студзень — ліпень больш за ўсё падаражэлі бульба і мука

Харчовыя тавары за студзень — ліпень гэтага года ў параўнанні з такім жа перыядам 2008 года падаражэлі на 18,1 %. Пра гэта паведамілі ў Галоўным статыстычным упраўленні сталіцы.

Цэны на муку падняліся на 30,9 %, на малако і малочныя прадукты — на 23,8 %, на яйкі, каўбасу, рыбу і морапрадукты — на 22,9 %, макарону — на 20,2 %, а на хлеб і хлебабулачныя вырабы — на 18,2 %. І толькі алей упаў у цане, прычым значна — на 25,1 %.

Бульба стала даражэй на 32,7 %. Затое іншая агародніна патаннела: за белакачанную капусту пачалі прасіць на 35,6 % менш, за моркву — на 22,5 %, а за салодкі перац — на 11,6 %.

Алена КЛІМКОВІЧ, «Мінск—Навіны».

Насельніцтва Беларусі ў студзені — ліпені набыло 797,8 кг золата

Аб'ём прададзеных насельніцтву ў студзені — ліпені гэтага года залатых мерных зліткаў склаў 797,8 кг (29933 штукі), паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі.

Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца 10-грамовыя залатыя зліткі, якіх за сем месяцаў прададзена 7792 штукі, або 26 %. Адзначана таксама цікавасць да 5- і 20-грамовых мерных зліткаў з золата: іх прададзена 6210 і 5837 штук адпаведна. У студзені — ліпені было набыта 33 зліткі па 1 кг і 90 — па 0,5 кг. Банкамі назад выкуплена 196,9 кг золата.

Паводле звестак на 21 жніўня 2009 года, цана продажу 1-грамовага залатога зліткa была ўстаноўлена Нацыянальным банкам у памеры Br110,49 тыс., зліткa 1 кг — Br90,3 млн. Аб'ём прададзеных за сем месяцаў сярэбраных зліткаў склаў 672,13 кг (11034 штукі). Найбольш папулярныя 10-грамовыя сярэбраныя зліткі: у студзені — ліпені куплена 3553 штукі. Паводле звестак на 21 жніўня, цана продажу 10-грамовага сярэбранага зліткa склала Br31,16 тыс., зліткa 1 кг — Br1,54 млн.

IPTV прываблівае новымі сэрвісамі

З 1 верасня вяшчанне інтэрактыўнага тэлебачання (IPTV) папоўніць новы канал. Ён уяўляе сабой інфармацыйную службу, з дапамогай якой абаненты IPTV змогуць атрымліваць інфармацыю пра ўсе сэрвісы інтэрактыўнага тэлебачання і паслугі «Белтэлекама», а таксама праглядаць анонсы фільмаў, даступных дзякуючы новай паслузе «віртуальная кіназала». Для больш хуткага і зручнага доступу інфаканал размесціцца ў спісе каналаў пад нумарам «адзін».

З верасня 2008 года лічбавае інтэрактыўнае тэлебачанне стала даступным усім жыхарам Беларусі, якія маюць у сваіх кватэрах і дамах стацыянарную тэлефонную сувязь. Адметнасцю тэлебачання новага пакалення з'яўляецца яго інтэрактыўнасць: магчымасць самастойна кіраваць жывым эфірам, не прывязваючыся да раскладу тэлепередач эфірнага тэлебачання, і карыстацца іншымі цікавымі сэрвісамі (караоке, персанальным відэамагнітафонам, функцыяй бацькоўскага кантролю і г.д.). На гэты момант абанентам IPTV даступныя больш як чатыры дзясяткі тэлевізійных каналаў.

«Віртуальная кіназала» — яшчэ адзін новы сэрвіс лічбавага інтэрактыўнага тэлебачання. «Віртуальная кіназала» арганізаваная на канале «43», дзе на працягу сутак кінафільмы транслююцца ў рэжыме рэальнага часу. Гэта значыць, што запланаваныя на пэўны дзень фільмы чаргуюцца і далучыцца да іх прагляду можна ў любы момант. Дзякуючы новаму сэрвісу, абаненты атрымаюць магчымасць не выходзячы з дому глядзець найбольш рэйтынгавыя і папулярныя фільмы. Да 1 кастрычніка «віртуальная кіназала» будзе працаваць бясплатна ў рэжыме тэсціравання. У перыяд тэставага карыстання паслугай абаненты змогуць убачыць каля 10 фільмаў, а ў далейшым, пры камерцыйнай эксплуатацыі, да прагляду будуць прапаноўвацца да 20 фільмаў штомесяц.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«Удалося захаваць усе асноўныя сацыяльныя гарантыі работнікаў»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Але ж заробкі аб'ектыўна зменшыліся?

— Большасць прадпрыемстваў за перыяд вымушанага водпуску выплачвала работнікам 2/3 тарыфнай стаўкі (акладу). Гэта вынік нашай упартай працы — неабходна ж людзям неяк кампенсаваць прастоі. Апошнім часам сітуацыя паляпшаецца: паводле інфармацыі рэспубліканскіх камітэтаў і абласных аб'яднанняў прафсаюзаў, у лістападзе на 55 прадпрыемствах людзі працавалі чатыры дні ў тыдзень, а ў папярэднім месяцы — на 63. Нехай не такія заўважныя змены да лепшага, але ж яны адбываюцца. Зноў-такі, не паўсюль, паколькі на асобных прадпрыемствах работнікі адпраўляюцца ў водпускі без аплаты — ёсць і такія прыклады. Гэта тыя суб'екты гаспадарання, якія апынуліся ў найбольш складаным становішчы. Калі прадпрыемства стаіць на мяжы выжывання, то галоўная задача — захаваць вытворчасць. Але нават і ў такой сітуацыі нельга забываць пра інтарэсы работнікаў. У першую чаргу такім прафсаюзным камітэтам выдзяляюцца грошы. Адпаведныя сродкі выдаткоўваюцца на аказанне матэрыяльнай дапамогі работнікам. На кожным прадпрыемстве вядзецца ўлік сем'яў, якія маюць невялікія даходы. Існуюць і выпадкі, калі чалавек апынуўся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Менавіта гэтыя людзі перш за ўсё фінансава падтрымліваюцца. Значныя грашовыя сродкі выдзяляліся для аказання дапамогі членам прафсаюзаў рэспубліканскімі камітэтамі работнікаў хімічнай, нафтавай і горнай прамысловасці, лесу, металістаў і шэрагу іншых.

«Кантракты эфектыўныя, калі ёсць стымулы»

— Аляксандр Сяргеевіч, неаднойчы даводзілася чуць, што скарачэнне аб'ёмаў вытворчасці і рэалізацыі прадукцыі, нявопўны рэжым працы прывялі не толькі да зніжэння памераў заробкаў, але і да ўзроўню сацыяльнай абароненасці работнікаў...

— Адна з галоўных нашых задач — захаваць сацыяльнасць калектыўных дагавораў. З іншага боку, неабходна разумець, што належнае выкананне нормаў, якія ў іх закладзены, напрамую залежыць ад фінансавага становішча канкрэтнага прадпрыемства. Ці магчыма ў такім разе знайсці выйсце з сітуацыі? Найбольш прадукцыйны шлях — не выключаць з калектыўных дагавораў нормы, выкананне якіх па аб'ектыўных прычынах цяпер пад пытаннем, а прыпыняць іх. Зразумела, гэта неабходна абмяркоўваць на агульным сходзе працоўнага калектыву. Сумесным рашэннем у шэрагу арганізацый былі часова прыпынены выдача пазык тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, выплаты матэрыяльнай дапамогі да водпуску, зменшаны памеры прэміяльных і г.д. Але ж сканцэнтрую вашу ўвагу — часова прыпынены! Як толькі прадпрыемства пачынае працаваць з прыбыткам, то ўсе «запазычаныя» выплаты работнікам будуць вернуты. Вось у чым стратэгія: калі выключыць нормы, то іх надзвычай цяжка пасля аднавіць. І іх прыпыненне — вымушаная мера, але такім чынам нам удалося захаваць усе асноўныя сацыяльныя гарантыі работнікаў.

— Прафсаюзы праводзяць і маніторынг рэалізацыі кантрактнай сістэмы. Якія тэндэнцыі адзначаюць такія даследаванні?

— Кантрактнай сістэмай ахоплена ад 80 да 100 працэнтаў прадпрыемстваў у розных галінах народнай гаспадаркі. Мы зусім не супраць, калі кантракт заключаецца з забеспячэннем росту заработнай платы, павелічэннем тэрміну водпускаў. Гэтыя ўмовы пакуль выконваюцца ў рэальным сектары эканомікі. Людзі належным чынам ацанілі такую форму. Прывяду канкрэтны прыклад. Колькі часу таму я прымаў удзел у пленуме Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў нафтавай і газавай прамысловасці. Выказаў ідэю ФПБ наконт таго, што калі чалавек адпрацаваў на кантракце пяць гадоў, то яго можна пераводзіць на бестэрміновы працоўны дагавор. Шчыра кажучы, не чакаў такой рэакцыі: людзі не ўхвалілі прапановы. У іх па кантракце прадугледжаны надбаўкі, дадатковы водпуск і г.д. Так што пры правільным падыходзе кантрактная сістэма вельмі эфектыўная, дазваляе належным чынам стымуляваць работнікаў.

— Але ж і парушэнняў хапае...

— Не без гэтага. Але недахопы абавязкова выпраўляюцца. Па-першае, вынікі маніторынгу рэалізацыі кантрактнай сістэмы перадаюцца ў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. У нас працуе прававая інспекцыя і людзям бясплатна аказваецца ўся юрыдычная дапамога. На прадпрыемствах прафкамамі створаны кансультацыйныя пункты, дзе работнікі могуць атрымаць усю неабходную інфармацыю, у тым ліку і пра фінансава-эканамічнае становішча прадпрыемства, перспектывы развіцця, выкананне нормаў калектыўнага дагавора і інш. Рэгулярна праводзяцца праверкі выканання працоўнага заканадаўства. Падчас іх нярэдка выяўляюцца розныя «хібы», якія своечасова выпраўляюцца. Работнікам вярнулі незаконна ўтрыманыя грошы (увогуле атрымаліся значныя сумы), многіх удалося аднавіць на працы. Выйгралі шмат судоў па абароне правоў работнікаў. Так што сітуацыя пад жорсткім кантролем прафсаюзаў і наймальнікі гэта ведаюць.

«На аздараўленні нельга эканоміць»

— І заканадаўчыя дакументы даводзіцца карэктаваць?

— Неабходна адстойваць інтарэсы працоўных — гэта наша цвёрдая пазіцыя. Напрыклад, доўга абмяркоўваўся Закон «Аб пенсійным сацыяльным страхаванні». І Федэрацыя прафсаюзаў з тым варыянтам, які прапаноўваў Урад, не пагадзілася. Быў праведзены грунтоўны маніторынг прадпрыемстваў, дзе ёсць шкодныя ўмовы працы. І нам удалося адстаяць сваю пазіцыю і абараніць правы работнікаў.

У цяжкія часы неабходна разам працаваць над пераадоленнем негатыўных наступстваў. Мы працуем поруч з наймальнікамі і з Урадам. У Беларусі добра развітая сістэма сацыяльнага партнёрства, якая дазволіла і падчас крызісных з'яў у эканоміцы ўтрымаць сітуацыю пад кантролем, не дапусціць росту сацыяльнай напружанасці. Мяркуецца стварыць грамадскі савет кіраўнікоў рэспубліканскіх прафсаюзаў, каб агульнымі намаганнямі імкнуцца знайсці выйсце са складанай сітуацыі.

Варта займацца не палітыкай, а эканомікай, рэальнай дапамогай людзям, што мы, дарэчы, заўсёды рабілі і робім. Чаго, на жаль, нельга сказаць пра так званыя «незалежныя» прафсаюзы, якія прапануюць «ударыць па крызісе» выключна лозунгамі, дэкларацыямі, патрабаваннямі. Хопіць слоў — патрэбны канкрэтныя справы. У цэнтры ўсіх пераўтварэнняў заўсёды стаіць чалавек. Мы запрашаем і нашых апанентаў да сумеснай працы, усё павінна адбывацца ў канструктыўным рэчышчы.

— Аляксандр Сяргеевіч, цяпер узнікла патрэба ў тым, каб сканцэнтраваць прафсаюзныя сродкі для дапамогі найбольш уразлівым катэгорыям насельніцтва. Пры гэтым давялося скараціць выдаткі на развіццё асобных кірункаў, напрыклад, аздараўленне?

— Аздараўлення гэта ні ў якім разе не датычыцца. Зменшыліся выдаткі на правядзенне пэўных культурна-масавых мерапрыемстваў. У сістэме ФПБ 12 санаторыяў, усе яны працуюць рэнтабельна. Паколькі загружаныя, для членаў прафсаюза — 15-працэнтная зніжка пры аплаце. Захаваліся дзіцячыя аздараўленчыя лагеры. Сёлета дзяцей аздаравілася больш, чым летась. Вось, напэўна, яскравы прыклад у адказ на вашае пытанне. На аздараўленні нельга эканоміць. На балансе прафсаюзных арганізацый застаюцца Дамы культуры, дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы. Адпаведная база захоўваецца, таму што заўсёды трэба бачыць перспектыву.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
Фота аўтара.

ЧАСТКОВАЕ ПАДАРАЖЭННЕ

Максімальны попыт на кватэры — толькі ўздоўж першай лініі метро

Менавіта ў апошнюю дэкаду жніўня і ў першую палову верасня на сталічным рынку арэнды жылля штогод назіраецца ажыятажны попыт на кватэры невялікіх плошчаў.

Аднапакаёўкі — не танней за 250 USD

Якраз у гэты час гаспадары «лішняга» жылля спрабуюць здаваць яго па максімальным кошце. Так, летась у першыя дні верасня жылля для іншагародніх катастрафічна не хапала, таму яно часова істотна тады і падаражэла. Нават стандартныя аднапакаёвыя кватэры ў звычайных пяціпавярховых дамах побач з метро летась каштавалі да 350 доларaў. Сёння на жыллёвым рынку назіраецца крыху іншая сітуацыя. Так, попыт істотна павялічыўся, але існуе і даволі вялікая прапанова.

Паводле інфармацыі **начальніка аддзела арэнды жылля сталічнага агенцтва «Час пік» Сяргея КАДОЛЫ,** як і месяц таму, мінімальны кошт арэнды аднапакаёвых кватэр у спальных раёнах складае 200 доларaў. Кватэры ў дамах уздоўж першай лініі метро прапануюцца ўжо не танней за 250 доларaў. Сярэдні кошт двухпакаёвых кватэр з мэбляй, халадзільнікам і тэлевізарам складае 300 доларaў. Разам з тым, сёння магчыма адшукаць двухпакаёвыя «хрушчоўкі» і да 250 доларaў. Дрэнным попытам карыстаюцца трохпакаёвыя кватэры, кошт арэнды якіх складае тыя ж 300 доларaў плюс квартплата.

Для студэнтаў — асобны цэннік

Істотная колькасць уласнікаў лішняга жылля звяртаецца ў агенцтвы з катэгарычнай умовай — каб у іх кватэрах не жылі студэнты. Аднак, існуе і другая катэгорыя гаспадароў, для якіх галоўнае — атрымаць максімальны прыбытак. Галоўным чынам, гэта ўладальнікі не вельмі якаснага жылля са старой мэбляй, але ў дамах побач з першай лініяй метро. Для студэнтаў тут прапануецца свой асобны цэннік, калі арэнда аднапакаёвых кватэр дасягае ўжо 300 доларaў, але... Між іншым, сёння ў Мінску яшчэ застаецца вялікі выбар розных па якасці і кошце кватэр. Таму нават прыкурснікі цяпер надта не мітусяцца, а скрупулёзна выбіраюць жыллё па якасці і кошце. Звычайна студэнты шукаюць цалкам «упакаваныя» кватэры, дзе абавязкова павінна быць канапа, кухня, халадзільнік, тэлевізар, а для дзяўчат пажадана яшчэ і сучасная пральная машына. Так, сёння ў агенцтве «завісла» трохпакаёвая кватэра ў Лошыцы за 250 доларaў плюс камунальныя паслугі, бо там няма канапы і тэлевізара.

Пакоі падаражэлі да 100 USD

Яшчэ два месяцы таму асобны пакойчык у звычайнай жылой кватэры магчыма было адшукаць у межах 70—80 доларaў. Цяпер студэнцкая хваля ўзняла кошт арэнды менавіта гэтай катэгорыі жылля. Сёння кошт пакоя на аднаго чалавека дасягае 100 доларaў. Калі пакой здаецца двум студэнтам, то бярэцца па 80 доларaў за кожнае ложак-месца. Для сям'і з малым дзіцем, ці без дзяцей — 150 доларaў за пакой.

Эксперты рынку арэнды амаль цалкам упэўненыя, што жыллё для студэнтаў надалей даражэць не павінна, бо ісnуе вялікая прапанова, але... Спецыялісты агенцтваў раяць іншагароднім менавіта цяпер заняцца пошукам жылля, а не ў верасні, калі трэба будзе вучыцца.

Сяргей КУРКАЧ.

Сярэднямесячны даход сям'і — 1,5 млн рублёў

Як паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце, сёлета за студзень — чэрвень сярэднямесячны даход сям'і склаў BR1,5 млн. У параўнанні з адпаведным леташнім перыядам паступленні павялічыліся на 15,5 працэнта (у той жа час цэны на спажывецкія тавары і паслугі ўзраслі на 14,6 %).

У разліку на члена хатняй гаспадаркі ў першым паўгоддзі даход склаў 586 тыс. рублёў, у хатніх гаспадарках без дзяцей — 663,8 тыс., з адным дзіцем — 553,4 тыс., з двума — 458,4 тыс., з трыма і больш — 311,4 тыс. Даходы жыхароў гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу ў 1,2 раза перавышалі даходы вяскоўцаў (адпаведна 613,4 тыс. і 507 тыс. руб.).

У 1,6 працэнта хатніх гаспадарак на чалавека выходзіла да BR200 тыс., у 6,5 % — ад 200 да 300 тыс., у 14,6 % — ад 300 да 400 тыс., у 18,4 % — ад 400 да 500 тыс., у 15,9 — ад 500 да 600 тыс., у 13 % — ад 600 да 700 тыс., у 8,7 % — ад 700 да 800 тыс., у 5,9 % — ад 800 да 900 тыс., у 4,5 % — ад 900 тыс. да 1 млн, у 4,6 % — ад 1 да 1,2 млн, у 3,3 % — ад 1,2 да 1,5 млн, у 3 % — больш чым 1,5 млн руб.

Доля малазабяспечаных хатніх гаспадарак (з узроўнем сярэднедушавога даходу, ніжэйшага за бюджэт пражыткавага мінімуму) у гарадах склала 4 працэнты, у пасёлках гарадскога тыпу 3,2 %, а ў вёсках — 6,2 %. У структуры адпаведных гаспадарак асноўную частку (72,1 %) складаюць сем'і, якія маюць няпоўнагадовых дзяцей. 22 % прыпадае на сем'і, якія не маюць дзяцей, і 5,7 % — адзінокія.

Сёлета ў першым паўгоддзі спажывецкія расходы склалі ў сярэднім BR1,1 млн на кожную хатнюю гаспадарку. У агульнай структуры выдаткаў у параўнанні з такім жа перыядам летась з 41,8 да 41,1 % зменшылася доля расходаў на набыццё прадуктаў харчавання, з 33,7 да 32,8 % — нехарчовых тавараў. А выдаткі на аплату паслуг узраслі з 22,1 да 23,9 %. Так адбылося з-за таго, што ў агульным аб'ёме спажывецкіх расходаў павялічылася доля выдаткаў на аплату жыллёва-камунальных (з 7,8 да 8,6%), бытавых (з 2,4 да 3,2 %), а таксама медыцынскіх паслуг (з 0,6 да 0,8 %).

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Пытальнік

«У БЕЛАРУСІ НЯМА ВЫТВОРЦАЎ ТАКОГА ТАВАРУ»

Кожны раз, калі я трапляю ў суседнюю харчовую краму, то бачу заклік, які непазбежна кідаецца ў вочы: «Купляйце беларускае!» Тое ж самае і я мог бы паўтарыць кожнаму, прытым, не толькі таму, што нас шчыра заклікаюць рабіць гэта і перыядычны друк, і дзяржаўныя дзеячы ўсіх узроўняў. Але, на найвялікшы жаль, не заўсёды атрымліваецца гэта рабіць. І вось чаму. Для лячэння варыкознага расшырэння венаў мне хірург з нашай паліклінікі парэкамендаваў купіць эластычныя панчохі. І сказаў, што беларускія не горшыя за любыя імпартныя. Я накіраваўся ў падарожжа па спецыялізаваных крамах. Пры гэтым даведаўся, што беларускія каштавалі б каля 15 тысяч рублёў, а амерыканскія — больш за 60 тысяч. Некалькі тыдняў шукаў я беларускія, але нічога ў мяне не атрымалася. І я купіў амерыканскія. Не давала спакою мне гэтая гісторыя на працягу доўгага часу. І раптам нарадзілася падазрэнне. На самых панчохах няма ніякай інфармацыі пра іх паходжанне. Дык ці не прадаюць беларускія пад выглядам імпартных і па чужой цане?

У.К., г. Мінск

— Апошні раз эластычныя панчохі для людзей, што пакутуюць ад варыкознага расшырэння венаў (яны падыходзяць і для жанчын, і для мужчын) і менавіта ад беларускага вытворцы паступалі да нас каля трох гадоў таму. Калі дакладна, з фабрыкі ў Віцебску. Але зноў жа, яны былі не лячэбнымі, а прафілактычнымі, — патлумачыў на наш запыт **начальнік аддзела арганізацыі рознічнага гандлю філіяла «Медыцынская тэхніка» УП «Белмедтэхніка» Віктар АПТАРЧЫК.** — Таму сёння ў аптэках «Белфармацыі» і крамах нашага прадпрыемства прадаюцца лячэбныя панчохі толькі імпартнай вытворчасці, у прыватнасці, з ЗША, Літвы і Італіі. Іх кошт складае, у залежнасці ад шчыльнасці, ад 45 тысяч рублёў і больш.

Так, пагадзіўся далей Віктар Казіміравіч, па ўсіх крытэрыях менавіта іх прадпрыемства павінна шукаць пастаўшчыкоў згаданага тавару, які так патрэбны людзям. І яно шукае. Толькі няма ў Беларусі вытворцаў лячэбных эластычных панчох, у якіх, як мы бачым, маюць неабходнасць грамадзяне з варыкозным расшырэннем венаў. Вось і даводзіцца закупляць імпарт...

Погляд

ІМПАРТУ Ў КРАМАХ СТАНЕ ПА-МІНІМУМУ?

Ініцыятыва павялічыць долю беларускай прадукцыі да 90 % у прадуктовых крамах і да 70 % у непрадуктовых прагучала на працоўнай нарадзе ў Фрунзенскім райвыканкаме сталіцы. На сёння гэтыя лічбы складаюць 80 % і 55 % адпаведна. Мы пацікавіліся меркаваннем Віктара МАРГЕЛАВА, старшыні саюза юрыдычных асобаў «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва», дырэктара гандлёвага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Трыдакта»:

— Пакуль гэтая ініцыятыва толькі ходзіць па калідорах і не сфармуляваная ў нарматыўны прававы акт. Дарэчы, і мінулыя патрабаванні былі такімі ж — але гэта не значыць, што іх можна было не выконваць, бо маглі ўзнікнуць праблемы... Я мяркую, што гэтая новая ініцыятыва будзе ў такой жа самай форме — форме патрабаванняў упраўленняў гандлю...

— Віктар Ягоравіч, асноўная мэта такой ініцыятывы якая? Мо каб разгрузіць склады з беларускай прадукцыяй?

— Я думаю, асноўная мэта — перашкода імпарту. У некаторай ступені гэта будзе дзейнічаць, але, дарэчы, можна прывесці прыклад і адваротнай рэакцыі. Вось паменшылі імпарт вінаградных вінаў — і людзі часткова пераключыліся на беларускае віно. А цяпер мы заўважылі, што ідзе агульны спад попыту на віно: імпартнага няма, а беларускае купляюць меней. Так можа атрымацца і з іншымі таварамі.

— У планах — давесці беларускую долю да 90 %. Якая яна, па вашых ацэнках, сёння і якія наступствы павелічэння могуць быць?

— Чым меншая крама, тым болей там айчыннай прадукцыі. Тыповая харчовая крама прадае працэнтаў 80 % айчынных тавараў. І не таму, што нехта прымушае, а таму што па цане і якасці беларускія харчовыя тавары нармальныя. Каўбаса сёння лепшая ўсё адно, малако нядрэннае, хлебам ды гарэлкай імпартнымі мы не гандлюем. Вось выходзячы з гэтага і атрымліваюцца 80 %. А вось пераход да 90 % можа быць і з пэўнымі пытаннямі: калі будуць вельмі жорсткія патрабаванні, то могуць быць і пабочныя з'явы. Перш за ўсё — калі чалавек не зможа купіць тое, да чаго ён прызвычаіўся. Ёсць жа крытычны імпарт — прадукцыя, якую мы не вырабляем. Гэта і фрукты, і сланечнікавы алей, які мы вырабляем не ў дастатковай колькасці, і сокі, і гарбата, і кава. Нават таго самага піва мы пакуль працэнтаў 25 п'ём імпартнага...

Мы яшчэ хацелі даведацца пра пункт гледжання на гэтае пытанне адпаведных гарадскіх адказных асобаў, але ў Галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама параілі звярнуцца ва Упраўленне гандлю і паслуг, з якім на момант падпісання нумара ў друк звязацца нам так і не ўдалося...

Павел БЕРАСНЕЎ.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

«ПЕРАДУМОЎ ДЛЯ ПАТАННЕННЯ ПАСЛУГ НА РАНЕЙ ПАБУДАВАНЫХ СТАЯНКАХ НЯМА»

Літаральна днямі была агучана інфармацыя, што, у сувязі з уваходам у сілу Указа кіраўніка дзяржавы № 427 «Аб патанненні будаўніцтва гаражоў і аўтамабільных стаянак», месца на стаянцы ў сталіцы будзе каштаваць аўтаўладальніку на 20 працэнтаў менш. Гэта стане магчымым дзякуючы прынятым мерам — вызваленню ад абкладання ПДВ абаротаў па рэалізацыі толькі пабудаваных гаражоў і аўтастаянак забудоўшчыкам, гаражным кааператывам, кааператывам, што вядуць эксплуатацыю аўтастаянак, а таксама вызваленню ад ПДВ абаротаў па будаўніцтве такіх аб'ектаў і адлічэнняў у інавацыйны фонд па іх. Крок, бясспрэчна, прыемны для ўладальнікаў «конскіх сілаў». Аднак такая інфармацыя не магла не выклікаць і заканамернага пытання, што і прагучала па рэдакцыйнай «гарачай лініі» ад мінчанкі.

— А ці будзе зніжана плата за карыстанне аўтастаянкамі, якія былі пабудаваныя раней? Я плачу ў месяц 48 тысяч рублёў за стаянку каля Маскоўскіх могілак. Палова стаянкі тут пустуе: людзі лічаць плату занадта высокай і стаяць машыны дзе заўгодна, толькі не тут. У выніку транспартам «забітыя» ўсе двары, тратуары, дарогі і г.д. Ці не рацыянальней усё ж зменшыць плату за карыстанне месцам на стаянцы, што ўжо працяглы час працуе?

Па каментарыі мы звярнуліся ў ахоўнае эксплуатацыйнае камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі». Вось што нам паведаміла **начальнік аддзела эканомікі Людміла БУКІНА.**

— На ўжо даўно дзейных аўтастаянках кошт машына-месца зніжацца ніяк не можа, бо для гэтага няма ніякіх перадумоў: выдаткі склаліся. Вы ж ведаеце, што пры будаўніцтве новых не будзе бракаваць ПДВ, значыць, і тарыфы будуць разлічвацца з улікам гэтага, — патлумачыла Людміла Уладзіміраўна. — Калі гаварыць канкрэтна пра стаянку побач з Маскоўскімі могілкамі і яшчэ некалькі, што месцяцца побач, дык мы летась знізілі плату за машына-месца недзе на паўгода з 48 тысяч да 43 тысяч рублёў у месяц. Ведаеце, ніякага асаблівага плёну гэта не дало — дастатковая колькасць месцаў усё адно пуставала. Такую інфармацыю мы атрымлівалі ад нашых кантралёраў са стаянак, таму, каб не несці яшчэ большыя страты, мусілі вярнуць тарыф назад. У чым прычына? Зараз вельмі многія маюць машыны, і ўсе жадаюць ставіць свой аўтатранспарт як мага бліжэй да пад'езда. А стаянкі, пра якія мы гаворым, размешчаны крыху далекавата ад жылых кварталаў.

— Тады, магчыма, варта было зрабіць зніжку большай, чым на 5 тысяч рублёў? І чытачка, і вы ўсё адно гаворыце, што там пустуе дастаткова месцаў...

— Наша прадпрыемства — нізкарэнтабельнае. Мы пралічылі, якую зніжку можам даць, каб заставацца на паверхні. Безумоўна, для іншага чалавека з невялікай зарплатай 5 тысяч рублёў — таксама грошы. А для кагосьці, хто карыстаецца камерцыйнай стаянкай і плаціць у месяц каля 120 тысяч рублёў за месца, гэта не вельмі значныя сродкі. Для нас жа ў межах усяго прадпрыемства нават такая гранічна дапушчальная зніжка вылівалася ў значную суму. Даць яшчэ большую зніжку, азначае, «загнаць» сябе ў «мінус», як я ўжо сказала вышэй, без гарантыі стопрацэнтнай запаўняльнасці месцаў. Дарэчы, з канца мінулага года для ўсіх катэгорый інвалідаў на нашых аўтастаянках дзейнічае зніжка на машына-месца ў памеры 15 працэнтаў ад тарыфу. І многія людзі, што маюць недарагія аўтамабілі і не вельмі высокія даходы, карыстаюцца паслугамі менавіта нашых стаянак.

— Так бы мовіць, выконваеце сацыяльную функцыю?

— Можна сказаць і так. Многія людзі дзякуючы гэтаму з'яўляюцца нашымі пастаяннымі кліентамі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

г. ВИТЕБСК 02.10.2009

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ, С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
41.	Не завершенное строительством здание склада заполнителей бетона, расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, промзона Ксты, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объектов недвижимости: фундаменты, степень готовности – 100 %, стены – нет, частично поперечные перегородки – 20 %, общая степень готовности – 8,8 %, общ. площадь 2350 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 223887000001000030, площадью 0,1237 га для обслуживания здания производственного назначения, сроком аренды 55 лет.	494 080	49 408
42.	Не завершенное строительством здание бетоносмесительного цеха, расположенное по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, Экиманьский сельсовет, в 0,4 км к востоку от деревни Ксты, и право заключения договора аренды земельного участка.	Характеристика объектов недвижимости: фундаменты, стены, перекрытия, степень готовности – 100 %, лестничные марши, проемы – 85 %, общ. площадь 1240 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 223887000001000088, площадью 0,0307 га для обслуживания здания бетоносмесительного цеха, сроком аренды 55 лет.	148 930	14 893

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 47 60 96, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ – Строительное

Прамая лінія

З БОЛЕМ У СЭРЦЫ — ДА ТЭРАПЕЎТА

Карысныя падказкі дае загадчыца тэрапеўтычнага аддзялення Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Ірына ЯКІМОВІЧ

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 22, 25, 26 жніўня.)

☎— Салігорск, Ганна Рыгораўна. У мяне паніжаная кіслотнасць страўніка, а ў мужа — павышаная. Які б нам знайсці кампраміс у харчаванні?

— У любым выпадку пры гастрыце выключаецца раздражняльная, вэнджаная, вострая, смажаная, тлустая ежа. Улічваючы гэта, вы можаце падабраць сабе агульнае харчаванне. А дадаткова пацыентам з паніжанай кіслотнасцю звычайна прызначаюць прэпараты, якія стымулююць кіслотнасць, пры павышанай — лекі, якія яе зніжаюць.

☎— Валожын, Тамара Фёдараўна. Мне 49 гадоў. Ціск 190/100. Прымаю два разы на дзень эналапрыл — 10 мг. Ці правільна я раблю? Можа трэба прымаць часцей?

— Пры такой высокай артэрыяльнай гіпертэнзіі як 190/100 недастаткова прыёму толькі аднаго прэпарату. У вашым выпадку рэкамендуецца камбінацыя прэпаратаў. Напрыклад, той жа эналапрыл неабходна прымаць з прэпаратамі групы эндапаміду або антаганістамі кальцыю дыгідраперэдзінавага раду. Аднак, каб падабраць адэкватнае лячэнне, трэба пракансультавацца з урачом. Дарэчы, вы можаце звярнуцца і ў наш Рэспубліканскі медыцынскі цэнтр рэабілітацыі і бальнеалячэння. У нас распрацавана праграма па лячэнні артэрыяльнай гіпертэнзіі, працуе школа артэрыяльнай гіпертэнзіі.

— А як можна да вас трапіць, ці патрэбна накіраванне?

— У цэнтры ёсць кансультацыйнае аддзяленне. Можна папярэдне запісацца па нумарах: 267 13 22, 267 65 10. Прыём вядзецца на платнай аснове. У гэтым выпадку накіравання не патрабуецца. Цэны дзяржаўныя. Знаходзімся мы ў Мінску па адрасе: вул. Макаёнка, 17.

☎— Віцебская вобласць, Ігар. Бывае, у мяне нечакана нямеюць пальцы рук. Кажуць, што гэта можа быць перад набліжэннем інсульту. Ці так гэта?

— Не. Хутчэй за ўсё, зняменне пальцаў рук у вас звязана з астэахандрозам шыйнага аддзела пазваночніка. Трэба абследавацца з гэтай прычыны — пракансультавацца са спецыялістам, зрабіць здымак.

☎— Бялынічы, Лідзія Іванаўна, 67 гадоў. У мяне стэнакардыя і ішэмічная хвароба сэрца. Раней прымала бесапралол і маначынкве. Потым ад іх адмовілася і паўтара месяца прымала толькі трызідзін-М. Месяц адчувала сябе добра. А потым пачаліся прыступы, хрыпы, якія асабліва ўзмацняюцца вечарам. Якія прэпараты мне трэба прымаць?

— Нельга было адмаўляцца ад бесапралолу і маначынкве і пакідаць толькі трызідзін-М. Так, апошні паляпшае абменныя працэсы мышцы ў міякардзе. Але яго трэба прымаць працягла, не менш як 6—8 месяцаў. Гэта дазволіць зменшыць прыступы стэнакардыі. Аднак аднаго трызідзіну-М, безумоўна, недастаткова. Бо такія прэпараты, як бесапралол і маначынкве, уплываюць на пашырэнне менавіта каранарных сасудаў і рэкамендуюцца пры ішэмічнай хваробе са стэнакардыяй. Калі ж па нейкай прычыне вам не падыходзяць прэпараты, ад якіх вы адмовіліся, то трэба яшчэ раз абмеркаваць з доктарам лячэнне і падабраць іншыя.

☎— Смаргонь, Людміла Анатольеўна. Дачцэ 9,5 года. У яе раз на месяц бываюць галаўныя болі, моташнасць, рэзка падае ціск, яна пацее. З чым гэта можа быць звязана?

— У дзяцей такое сустракаецца даволі часта. Падчас актыўнага росту можа парушацца вегетатыўная функцыя нервовай сістэмы. Хутчэй за ўсё, у вашай дачкі — вегетасасудзістая дыстанія. Гэта функцыянальны неарганічны стан. Як правіла, з узростам усё стабілізуецца. Аднак праблему лепш абмеркаваць з педыятрам. Магчыма, дзяўчынцы трэба зрабіць рээнцэфалаграму, і ў адпаведнасці з выні-

Раніца на возеры Святое ў вёсцы Дубені Барысаўскага раёна. Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Краіна здароўя

Выпуск № 30 (144)

камі абследавання доктар прызначыць належныя прэпараты.

☎— Ляхавіцкі раён, Вольга Андрэеўна, 75 гадоў. У мяне ішэмічная хвароба сэрца, перанесла тры інфаркты міякарда. Адчуваю сябе дрэнна, пастаянна скача ціск. Можа быць 170/100, а потым 100/60. Ацякаюць ногі. Выпісалі амладыпін, сіднафарм, эналапрыл. Але лекі дапамагаюць слаба. Як быць?

— Ацёкі ніжніх канечнасцяў могуць быць абумоўлены прыёмам амладыпіну. Калі яны вельмі выражаныя, трэба крыху памяняць тэрапію. Што датычыцца ціску, то нельга, каб ён так рэзка вагаўся. Я раю вам завесці дзённік і запісваць у ім раніцай, днём і вечарам кожнага дня лічбы ціску. А потым падысці з гэтым дзённікам да доктара. Спецыяліст падбярэ патрэбную менавіта вам дозу прэпаратаў — згодна з ваганнямі артэрыяльнага ціску на працягу дня. І, магчыма, трэба замяніць амладыпін на прэпарат з ліку бэтаадрэнаблакатараў.

☎— Шаркаўшчына, Ірына Аляксандраўна, 82 гады. У мяне дыягназ — параксізмальная форма мігальнай арытміі. Прымаю атэналол — 12,5 мг, 1 таблетку аміядарону, 1 таблетку палакарду. Аднак прыступы паўтараюцца 2 разы ў месяц. Што можна прымаць дадаткова, каб зняць прыступы?

— Вам правільна прызначаны антыарытмічныя прэпараты для папярэджвання прыступаў мігальнай арытміі. Адно, з улікам вашага ўзросту і дыягназу, трэба яшчэ прызначыць прэпараты, якія паляпшаюць метабалічныя працэсы міякарда, абмен у мышцы сэрца, умацоўваюць яе. Гэта можа быць трызідзін М або яго аналаг прэдуктал МР. Прэпараты прымаюцца па 1 таблетцы 35 мг два разы на дзень. І не менш як 6—7 месяцаў. У вашай сітуацыі можа быць і пастаянна. Распытайце пра гэта свайго доктара.

Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.

У ЛІПЕНІ — 120 ВІЧ-ІНФІЦЫРАВАНЫХ

У Беларусі ў студзені—ліпені гэтага года выяўлены 583 ВІЧ-інфіцыраваныя (за аналагічны перыяд 2008 года — 488). Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Рэспубліканскім цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.

У ліпені гэтага года выяўлены 120 ВІЧ-інфіцыраваных. Сярод рэгіёнаў рэспублікі найбольш выпадкаў ВІЧ-інфекцыі за ліпень зафіксавана ў Гомельскай вобласці (59). У Светлагорску — 27 выпадкаў інфіцыравання, Светлагорскім раёне — 4 выпадкі, у Брэсцкай вобласці — 15 выпадкаў ВІЧ-інфекцыі, у Віцебскай — 12, Мінскай — 11, у Мінску — 9, у Гродзенскай вобласці — 8, у Магілёўскай — 6.

На 1 жніўня гэтага года агульная колькасць зарэгістраваных у рэспубліцы выпадкаў ВІЧ-інфекцыі дасягнула 10 тыс. 201 (105,5 на 100 тыс. насельніцтва). 10-тысячны рубеж быў перасягнуты ў маі гэтага года. Адлік вядзецца з 1987 года, калі дыягназ ВІЧ быў пастаўлены першаму пацыенту. Сярод рэгіёнаў краіны найбольш выпадкаў ВІЧ-інфекцыі зафіксавана ў Гомельскай вобласці (5803 выпадкі, 362,1 на 100 тыс. жыхароў), на другой пазіцыі — горад Мінск (1419, або 77,6 на 100 тыс.), на трэцяй — Мінская вобласць (1301, або 89,5 на 100 тыс. насельніцтва). Самыя нізкія гэтыя паказчыкі ў Гродзенскай вобласці (396 выпадкаў, або 35,9 на 100 тыс. жыхароў). Пераважная большасць ВІЧ-інфіцыраваных — маладыя людзі ва ўзросце ад 15 да 29 гадоў.

У Беларусі зарэгістраваны 1740 выпадкаў смерці сярод ВІЧ-інфіцыраваных (у тым ліку з пачатку гэтага года 208). З ліку памерлых 69,9 працэнта былі наркаспажыўцамі.

Минский городской центр недвижимости

ОАО «ВИТЕБСКОБЛРЕСУРСЫ» (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА)

ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже складских помещений с элементами благоустройства, гаражей и иного имущества, расположенного на ул. М. Горького, 197 в г. Витебске, единым лотом. В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование объектов	Литер
1.	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-50614 (здание складских помещений) общей площадью 690 кв. м (год постройки – 1969), в том числе составные части:	В1/к
1.1.	Площадка – 1550 кв. м	А
1.2.	Камень бортовой – 115,15 м	а1
1.3.	Участок ограждения – 7,55 м	б1
1.4.	Ворота въездные – 5,9 м	б2
1.5.	Участок ограждения – 12,35 м	б3
1.6.	Участок ограждения – 2,20 м	б4
1.7.	Участок ограждения – 118,3 м	б5
1.8.	Участок ограждения – 2,85 м	б6
1.9.	Ворота въездные – 5,90 м	б7
1.10.	Участок ограждения – 30,35 м	б8
1.11.	Калитка – 1,5 м	б9
1.12.	Труба дымовая – 1 кв. м	
1.13.	Уборная – 3 кв. м	
2.	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-50616 (здание гаражей) общей площадью 53 кв. м (год постройки – 1993).	
3.	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-59952 (сооружение специализированное энергетики – электрическая сеть) протяженностью 233,7 м	
4.	Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-59951 (сооружение специализированное энергетики – тепловая сеть) протяженностью 83,1 м	

Земельный участок площадью 0,2681 га, кадастровый номер 240100000003000118 предоставлен в постоянное пользование для содержания и обслуживания существующих зданий по ул. М. Горького, 197 в г. Витебске.

Начальная цена лота – 311 773 392 белорусских рубля без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 30 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта (лота) осуществляется в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа. Аукцион состоится **16 сентября 2009 года** в 15.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **14 сентября 2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;
(0212)27 23 16 – ОАО «Витебскоблресурсы».

НЕ ПАЛОХАЙЦЕ ЛУНАЦІКА!

Самнамбулізм (у прастамоўі — лунацізм) — даволі распаўсюджаная з'ява. Перыядычна ходзяць у сне мільёны людзей (прыкладна 2 % насельніцтва зямнога шара). Прычым каля 25 % лунацікаў наносяць сабе розныя пашкоджанні падчас начных блуканняў. Да нядаўняга часу паводзіны самнамбулы многія звязвалі з чымсьці таямнічым і невытлумачальным. Між тым, вучоныя знайшлі тлумачэнне гэтага незвычайнага стану. Што ж прымушае людзей рабіць бессэнсоўныя прагулкі ўначы і ці можна вылечыцца ад гэтага?

Тэрмін «самнамбулізм» перакладаецца з лацінскай мовы як «хаджэнне ў сне». А вось слова «лунацізм» звязанае з уяўленнямі многіх старажытных народаў аб уплыве цыклаў Месяца на псіхіку чалавека. Дарэчы, сучасная медыцына не лічыць прычынай лунацізму непасрэдна Месяц, аднак цалкам гэтага не адмаўляе, паколькі менавіта ў поўню ў самнамбулаў пачынаецца абвастрэнне.

Паводле меркавання вучоных, самнамбулізм — гэта парушэнне сну, звязанае з няпоўным прабуджэннем. Яго прычынамі становяцца розныя нейрафізіялагічныя працэсы. А апошнім часам усё часцей з'яўляюцца паведамленні аб тым, што схільнасць да самнамбулізму прадвызначаецца генетычнымі фактарамі.

На якім этапе сну самнамбула робіць свае «экскурсіі»?

У здаровага чалавека адразу пасля засынання пачынаецца так званая фаза павольнага сну, якая доўжыцца 60—90 хвілін. За гэты час сон праходзіць чатыры стадыі развіцця — ад паверхневага да самага глыбокага. Тонус мышцаў захоўваецца, чалавек часта мяняе позу і не бачыць сноў.

Для фазы хуткага сну, якая прыходзіць на змену павольнаму, характэрны расслаблены стан усіх мышцаў цела. Менавіта ў такія моманты ў нас бываюць сны. На працягу ночы гэтыя фазы змяняюць адна адну некалькі разоў. «Прыступ» самнамбулізму можа здарыцца падчас глыбокага павольнага сну, пры гэтым тармажэнне цэнтральнай нервовай сістэмы не распаўсюджваецца на ўчасткі мозга, якія вызначаюць рухальныя функцыі. Зараджэнне такога стану вучоным удалося зафіксаваць з дапамогай электраэнцэфалаграфіі — рэгістрацыі біяэлектрычнай актыўнасці галаўнога мозга. У выніку ўяўленні аб тым, што самнамбула паўтарае дзеянні, якія ён бачыць у сне, аказаліся памылковымі. Непрацяглы «прыступ» праходзіць без змянення стадыі сну. Самнамбула можа падняцца і сесці на ложку, вымавіць некалькі слоў, пасля чаго зноў засынае. Калі правесці энцэфалаграфічныя даследаванні падчас працяглых прагулак у сне, прыборы зарэгіструюць прыкметы дрымоты і няспання. У самнамбулы «ўключаны» ўсе органы пачуццяў. Вочы яго расплюшчаныя, ён усё чуе, бачыць, адчувае, падтрымліваючы раўнавагу цела не горш, а часам і лепш, чым у момант няспання. Гэтым і тлумачыцца легендарная спрытнасць самнамбулаў. Аднак пачуццё страху і небяспекі падчас такіх блуканняў у чалавека моцна прытуплена, і ён можа здзейсніць галавакружны трук, на які б не рашыўся наяве. Пасля поўнага прабуджэння самнамбула нічога не памятае пра свае начныя прагулкі. Раніцай ён можа вельмі здзівіцца, выявіўшы, што ён не ў ложку, а на балконе ці лесвічнай пляцоўцы, прычым у сподняй бялізне.

Вучоныя зазначаюць: развіццю самнамбулізму нязменна папярэднічаюць такія парушэнні сну, як часты, да 3—4, прабуджэнні за ноч і пастаяннае гаварэнне ў сне.

Ці можна лічыць самнамбулізм сур'ёзным захворваннем?

Усё залежыць ад канкрэтных прычын, якія выклікаюць парушэнне сну. Часам цалкам здаровы арганізм так рэагуе на стрэсавую сітуацыю. Часта прагулкі ў сне здзяйсняюць празмерна эмацыянальныя людзі або тыя, у каго ёсць спадчынная схільнасць да самнамбулізму. Нярэдка ў дарослых людзей хаджэнне ў сне выклікаецца неўрозамі і іншымі парушэннямі ў рабоце нервовай сістэмы. Лунацізм таксама можа быць праявай эпілепсіі, прычым часта ён становіцца прадвеснікам гэтага захворвання, з'яўляючыся за некалькі гадоў да ўсіх астатніх сімптомаў.

Чаму часцей за ўсё самнамбуламі становяцца дзеці і падлеткі?

У дзяцей гэта звязана з асаблівасцямі біяэлектрычных працэсаў, што адбываюцца ў кары галаўнога мозга. Як правіла, гэта «хвароба росту» праходзіць сама па сабе, калі яна не выклікана паталагічнымі змяненнямі ў цэнтральнай нервовай сістэме.

Што рабіць, калі ў вас ці ў каго-небудзь з вашых блізкіх праяўляецца лунацізм?

Пасля першага зафіксаванага выпадку хаджэння ў сне абавязкова трэба звярнуцца па кансультацыю да неўрапатолага. Калі ўрач палічыць неабходным, вам зробяць энцэфалаграфію і тамаграфію галаўнога мозга, што дапаможа выключыць з магчымых прычын эпілепсію.

У здаровых людзей самнамбулізм — з'ява часовая і, як правіла, не патрабуе спецыяльнай тэрапіі. А вось калі ён звязаны з эпілепсіяй, неўрозамі і іншымі парушэннямі нервовай сістэмы, неабходна лячыць гэтыя прычынныя захворванні. Калі падчас неўсвядомленых «экскурсій» чалавек атрымлівае траўмы, доктар можа выпісаць прэпараты для карэкцыі фаз сну. Іх прыём значна скарачае перыяд павольнага сну за кошт павелічэння хуткага. Дарэчы, асноўную трывогу самнамбулы і яго блізкіх выклікаюць менавіта траўмы. Бо чалавек, які не здольны да канца кантраляваць рэальнасць, можа ўпасці з ложка, стала, падваконня ці з акна. (Вядомыя нават выпадкі, калі самнамбулы пакідалі кватэры, спрабавалі ехаць на машыне.) Каб начныя прагулкі не закончыліся трагедыяй, пастарайцеся на ноч хаваць ключы ад уваходных дзвярэй і машыны. Калі эпізоды хаджэння ў сне даволі працяглыя, неабходна паставіць краты на вокны, прыняць траўманебяспечныя прадметы, адключыць электрапрыборы, па магчымасці «згладзіць» вострыя вуглы ў кватэры.

Калі хто-небудзь з вашых блізкіх пакутуе ад лунацізму, будзьце ўважлівыя да яго сну. ***Лунаціка падчас начных блуканняў нельга палохаць, гучна клікаць — трэба пастарацца як мага асцярожней правесці яго да ложка!***

Асаблівай увагі патрабуюць дзеці-самнамбулы. Пастарайцеся заўсёды заканчваць дзень гутаркай з дзіцем, абмяркоўваючы найважнейшыя падзеі. Пахваліце малое за добрыя ўчынкі, а за дрэнныя — паўшчувайце раніцай. Ніякіх казак і гісторый з прыгодамі на ноч! Апошнія мала падыходзяць для дзіцяці з парушэннямі сну, паколькі гэта можа даць яго мозгу падставу для начной прагулкі. Тое ж самае адносіцца і да прагляду фільмаў жахаў і востраскюжэтных тэлеперадач. Старайцеся перад сном разгрузіць мозг дзіцяці ад уражанняў і перажыванняў дня.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Інфарм-укол

Каму піць аспірын?

Вядома, што аспірын падаўляе актыўнасць трамбацытаў, клетак, якія адыгрываюць важную ролю ў згусальнасці крыві і ўтварэнні крывянога згустка. Па гэтай прычыне аспірын можа зменшыць або папярэдзіць звужэнне прасвету сасудаў пры атэрасклерозе. Урач можа параіць штодзённы прыём аспірыну, калі:

- Вы пакутуеце ад атэрасклерозу, стэнакардыі, артэрыяльнай гіпертаніі або мігальнай арытміі. Кожнае з іх стварае павышаную рызыку інфаркту міякарда або мазгавога інсульту.
- Трэба пазбегнуць паўторнага інфаркту міякарда.
- Вы перанеслі аперацыю аортакаранарнага шунціравання, то для зніжэння верагоднасці трамбозу, у прасвеце шунта і профілактыкі ўтварэння ў ім атэрасклератычных бляшак.

У малых дозах аспірын, як правіла, бяспечны. Аднак калі няма сардэчна-сасудзістых расстройстваў, то не факт, што аспірын спрыяльна ўздзейнічае. Ён можа выклікаць страўнікавае кровацячэнне. Рызыка зменшыцца, калі прымаць таблеткі ў абалонцы, якая растворваецца ў тонкім кішэчніку, а не ў страўніку.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Траўмапункт

ЛЕТНІЯ РАНЫ

Летні траўматызм мае свае сезонныя асаблівасці. Пра іх мы і пагаворым сёння.

Даволі часта прычынай сур'ёзных траўмаў становяцца вадаёмы. Аматары даваць нырца бывае грэбуюць правіламі бяспекі. Ныраюць на мелкаводдзі ў незнаёмых месцах, а гэта прыводзіць да таго, што, ударыўшыся галавой аб дно, чалавек ломіць пазваночнік у шыйным аддзеле і часта застаецца інвалідам на ўсё жыццё. «Да 80 працэнтаў нырцоў, якія атрымліваюць траўмы або гінуць, знаходзяцца ў нецвярозым стане», — падкрэслівае загадчык прыёмнага аддзялення РНПЦ «Траўматалогія і артапедыя» Сяргей Казаеў.

У летні траўматызм робяць свой унёсак і дачныя клопаты. На прыватных падворках пачынаецца збор ураджаю садавіны. Па слівы—яблыкі людзі лезуць на дрэвы. І вельмі часта пры гэтым падаюць. А падзенне з вышыні 1—2 метраў можа прывесці да пералому канечнасцяў, пазваночніка. Свае «ахвяры» збірае і работа з электраабсталяваннем на лецішчах і ў гаражах.

Часцей за ўсё людзі атрымліваюць траўмы ў стане алкагольнага ап'янення. У цёплыя дні, асабліва моладзь, гуляе амаль да раніцы, а спіртное можна набыць ледзь не да першых пеўняў. Вось і атрымліваецца ланцужок: чарка—скварка—бойка... Траўма. Самыя цяжкія дні для траўматолагаў — пятніца, субота, нядзеля. Колькасць медыкаў у брыгадах заўсёды аднолькавая, а вось колькасць пацярпелых у гэтыя дні ў разы большая, чым у звычайныя. Акрамя таго, з пацыентамі нападпітку вельмі цяжка працаваць. Яны недаацэньваюць цяжкасць траўмы і хоць іх прывозяць на «хуткай дапамозе», медыкі часта не могуць іх утрымаць, каб аказаць гэтую самую дапамогу. Такія пацыенты лаяцца, брыдкасловяць, бывае, самі пакідаюць медустанову.

Варта сказаць пра такі модны павеў, як скутары. Для язды на гэтым жалезным кані не патрабуюцца правы, іх кіроўцы часта нецвярозыя. Таму скутар таксама можа стаць крыніцай траўмы.

Летам болей становіцца ахвяраў дарожна-транспартных здарэнняў. У зімовы перыяд кіроўцы транспарту больш насцярожана ставяцца да дарогі. Галалёдзіца, снежныя заносы спрыяюць пільнасці, прымушаюць захоўваць хуткасны рэжым. А летам, калі дарога сухая, можна, быццам, і расслабіцца, праехацца з ветрыкам. Акрамя таго на лецішчы і загарадны адпачынак едуць сем'ямі. У аўто знаходзяцца некалькі чалавек. Значыць, у выніку дарожна-транспартнага здарэння пацярпелых аказваецца больш.

Сур'ёзныя траўмы атрымліваюць людзі, якія падаюць з колаў. Звычайны малюнак. Падчас сенакосу на возе з травой утульна ўладкоўваецца вознік. Засынае пад мерную хаду каня і раптоўна ляціць уніз. Зноў-такі сваю справу часта робіць гарэлка. У выніку — траўмы, найбольш небяспечныя з іх — пералом шыйнага аддзела пазваночніка.

Для летняга перыяду характэрна павелічэнне колькасці ранаў. Калі зімой пераважаюць пераломы прамянёвай косці, галёнкаступнёвага сустава, то летам пашкоджанні скурных покрываў узрастаюць мінімум у 10 разоў.

Летам да траўматолагаў часта звяртаюцца людзі з укусамі кляшчоў. Гэтыя насякомыя завалодалі тэрыторыямі амаль усіх гарадскіх паркаў. Як вядома, кляшчы — пераносчыкі лаймабарэліёзу. Аднак часта людзі спрабуюць самастойна выкалупліваць крывасмокаў пры дапамозе розных народных хітрыкаў. У гэтым выпадку практычна поўнасцю дастаць кляшча немагчыма, пад скурай застаюцца яго фрагменты. Да медыкаў звяртаюцца людзі, у якіх якраз і засталіся такія фрагменты. Але рэшткі кляшча ўжо не дадуць ніякай інфармацыі аб тым, ці было заражана насякомае. Пра гэта «скажа» толькі жывы клешч. Таму яго лепш не даставаць самастойна, а прыехаць у медустанову, дзе спецыялісты зробяць гэта, і адправяць кляшча на даследаванне ў цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. Калі крывасмок быў заражаны, то чалавеку прызначаць адпаведнае лячэнне.

Вольга ШАЎКО.

БЕЛАРУСКАЕ КУПЛЯЙЦЕ, АЛЕ Ж НА ТЭРМІН ЗАХОЎВАННЯ ГЛЯДЗІЦЕ ЎВАЖЛІВА

У выніку праверкі Жлобінскага раённага спажывецкага таварыства Камітэтам дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці ва ўсіх шасці правераных крамах выяўлены продаж тавараў, тэрмін прыдатнасці якіх скончыўся.

Сёлета тут сістэматычна выкрываліся мясныя паўфабрыкаты, якія ў парушэнне санітарных нормаў і правілаў пасля прыгатавання яшчэ раз замарожваліся. У гандлёвую сетку такая прадукцыя адпускалася пасля 3—20 сутак з моманту прыгатавання. Усяго рэалізавана нестандартных паўфабрыкатаў на 53 мільёны рублёў, — паведамляе прэс-служба Камітэта дзяржаўнага кантролю Гомельскай вобласці.

Акрамя таго, былі выпадкі, калі на спажывецкую ўпакоўку кандытарскіх вырабаў наносілася не сапраўдная дата вырабу, а на дзень пазнейшая. На харчовым складзе і ў кандытарскім цэху тавары, якія хутка псуюцца (маргарын, яйкі і іншыя), захоўваліся без выканання неабходнага тэмпературнага рэжыму, а чатыры з пяці аўтакрамаў неправозілі харчовыя тавары па санітарным пашпарце на транспартныя сродкі, тэрмін дзеяння якога закончыўся месяц таму.

Па выніках праверкі 14 адказных асобаў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці са штрафам на агульную суму 3 мільёны рублёў,16 — да дысцыплінарнай. На арганізацыю таксама накладзены штраф у памеры 49 мільёнаў рублёў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

СВЕДЕНИЯ ОБ ОБЪЕКТАХ РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, ПОДЛЕЖАЩИХ РАЗГОСУДАРСТВЛЕНИЮ И ПРИВАТИЗАЦИИ

Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность			Республиканское унитарное предприятие «Гродносортсемовощ» (РУП «Гродносортсемовощ»), Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь	Строительно-монтажное республиканское унитарное предприятие «Белстромавтоматика» (УП «Белстромавтоматика»), Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь	Снабженческо-производственное республиканское унитарное предприятие «Коммунальник» (СПРУП «Коммунальник»), Министерство жилищно-коммунального хозяйства Республики Беларусь	Производственно-внедренческое республиканское унитарное предприятие «Инкотех» (УП «Инкотех»), Министерство архитектуры и строительства Республики Беларусь	Республиканское производственно-торговое унитарное предприятие «Белинкоммаш» (РПТУП «Белинкоммаш»), Министерство жилищно-коммунального хозяйства Республики Беларусь
Адрес			231300, г. Лида-14, Северный промузел	220099, г. Минск, ул. Брестская, 18	220073, г. Минск, ул. Харьковская, 14	220002, г. Минск, пр. Машерова, 29	220070, г. Минск, ул. Радиальная, 36
Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции			Оптовая торговля зерном, семенами и кормами для животных, розничная торговля семенами и удобрениями	Пусконаладочные работы	Оптовая торговля	Разработка программного обеспечения	Оптовая торговля котельным оборудованием, лесозаготовительной техникой, финансовый лизинг, научно-исследовательские работы
Положение на рынке			Не занимает доминирующего положения	Не занимает доминирующего положения	Не занимает доминирующего положения	Не занимает доминирующего положения	Не занимает доминирующего положения
Планируемые сроки разгосударствления и приватизации			4 квартал 2009 г.	4 квартал 2009 г.	4 квартал 2009 г.	4 квартал 2009 г.	4 квартал 2009 г.
Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации			Создание открытого акционерного общества	Создание открытого акционерного общества	Создание открытого акционерного общества	Создание открытого акционерного общества	Создание открытого акционерного общества
Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение			Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39	Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8	Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8	Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8	Минский городской территориальный фонд государственного имущества 220050, г. Минск, пр. Независимости, 8
Численность работающих, чел.			20	56	78	25	32
Срок предъявлений претензий			Месяц со дня опубликования	Месяц со дня опубликования	Месяц со дня опубликования	Месяц со дня опубликования	Месяц со дня опубликования
Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО, руб.			2 415 859 600	2 150 042 400	2 434 389 352	263 982 400	537 187 200
Стоимость основных фондов – всего, руб.			1 790 039 585	1 747 719 983	1 913 491 031	62 297 317	96 951 504
Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га			4,906	1,4903	6,6198	нет	нет
Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, руб.			нет	нет	нет	нет	нет
Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб.			нет	нет	нет	7 131 355	нет
Финансовое состояние объекта, руб.	Балансовая прибыль		-252 385 408	303 000 000	36 404 250	41 448 756	599 783 624
	Задолженность	кредиторская	513 029 154	170 696 205	1 291 507 773	44 545 324	4 431 768 534
		дебиторская	47 101 941	–	1 033 805 581	2 760 686	6 800 565 140

УНП 100745627.

ТРЫ КРАІНЫ — АДЗІН АРКЕСТР

Шэсцьдзясят юных музыкантаў з Беларусі, Польшчы і Эстоніі ў складзе аркестра «Wersalinka» выступілі з канцэртамі ў Міры і Карэлічах.

Назва гэтага ўнікальнага калектыву паходзіць ад палаца графа Браніцкага ў Беластоку, які з-за падабенства з Версальскім палацам у Парыжы называюць Паўночным Версалем. Міжнароднаму аркестру, паведаміў кардынатар акцыі Томаш Чарнецкі, споўнілася чатыры гады. Яго ўдзельнікі вучацца ў музычных школах і гуртках пры сярэдніх школах, а некалькі трубачоў — у музычных вучылішчах.

Сёлета аркестр «Wersalinka» ўжо выступіў у Эстоніі, а пасля канцэртаў у Беларусі накіраваўся ў Польшчу. «Праграму мы падрыхтавалі за пяць дзён, дагэтуль дзеці наогул не бачылі гэтых нотаў, але ж добра сыгралі!» — зазначыў дырэктар Карэліцкай школы мастацтваў Іосіф Улан. Гледачы пацвердзілі гэта гарачымі апладысментамі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

У пошуку... цукерак

Мова — душа народа

Што падарыць гасцям, якія прыязджаюць да вас з іншай краіны? Зразумела ж, нешта беларускае, прычым не толькі што датычыцца вытворцы, але і назвы тавару. Вось, напрыклад, класіка падарункавага «жанру» — цукеркі. Мяркуючы па паліцах крамаў, наша айчынная прамысловасць прапануе проста вялізны асартымент, на любы густ. Праўда, гэта ў асноўным «конфеты», а вось з «цукеркамі», як перакануюся нядаўна аўтар гэтых радкоў, праблематычна.

У гродзенскім гандлёвым доме «Няміга — Фаварыт» (назва даецца ў перакладзе з рускай мовы) ёсць цукеркі і ўкраінскай вытворчасці, але значна больш шырокі, як і мае быць, асартымент беларускіх прадпрыемстваў «Камунарка» і «Спартак». Пры гэтым набыць каробку з назвай на ўкраінскай мове можна, а на беларускай, як высветлілася, нельга. І гэта ў Беларусі... Нават 200-грамовыя пакункі, дзе, у адрозненне ад «Аэрофлотских», проста напрошваецца беларускамоўная назва, і тыя па-руску («Белорусские», «Лявониха», «Белорусская картошка»).

Праўда, вось выраблены ў Асіповічах набор «Родны кут». Незразумела толькі, чаму гэта не «шакалад горкі», а «шоколад горький». Няўжо першы варыянт паставіць у тупік кліентаў? Яны што, не зразумеюць, якая прадукцыя ў гэтым наборы?

Цікаўлюся меркаваннем прадаўшчыцы, чаму «пакрыўджаныя» беларускамоўныя назвы гэтых і іншых выстаўленых у краме прадуктаў харчавання (акрамя хіба што хлеба «Зорка гандлю» і «Спадар», ды і то з далейшай інфармацыяй на этыкетках па-руску)? На яе думку, вытворцы не атрымліваюць адпаведнага распараджэння. Аднак няўжо і тут патрэбныя нейкія адміністрацыйныя меры? Чаму тое, што лічыць за норму кіраўнік украінскага прадпрыемства, не з'яўляецца натуральным для яго беларускага калегі?

Зрэшты, прадаўшчыца прыгадала, што нядаўна ў продажы быў адзін з відаў падарункавых набораў цукерак з назвай па-беларуску. Значыць, калі гэтых каробак ужо няма, то попыт ёсць. А калі так, то дзе ж тады не адзінкавая, а шырокая прапанова?

Пакідаючы краму, нарэшце заўважаю (які цуд!) словы па-беларуску: «Інфармацыя для пакупнікоў». Чым беларускамоўнасць стэнда з неабходнымі для спажыўцоў звесткамі і абмежавалася. Але і гэта яшчэ добра, бо ў размешчаным па-суседску аддзяленні аднаго з банкаў няма і таго...

А мы працягваем пошук цукерак. У адным з кандытарскіх павільёнаў на Грандзіцкім рынку асартымент вырабаў таксама вялікі, аднак... «Прабачце, ніводнай каробкі з назвай на беларускай мове няма», — адказвае гандляр, і такое ўражанне, што яму самому за такое соромна. І сапраўды, як патлумачыць гэта нашым гасцям, ды і самім сабе, жыхарам Беларусі?

Мо пашанцуе ў размешчанай побач краме фірмы «Мока»? З яўнай перавагай тут таксама «лідзіруе» другая з дзяржаўных моў нашай краіны. Хаця, у параўнанні з вышэйзгаданым гандлёвым домам «Няміга — Фаварыт», назіраецца вельмі сціплы, але ўсё ж пэўны прагрэс і ў дачыненні да першай дзяржаўнай мовы — беларускай: прапануецца падарункавы набор цукерак «Папараць кветка».

А вось яшчэ адна вельмі прыгожая каробка незвычайнай формы ад сталічнай «Камунаркі». Прыгледзеўся — на ўпакоўцы нават паэтычныя радкі: «Нам без бульбы беларускай немагчыма дня пражыць — тым, хто любіць нашу бульбу, маладым заўсёды быць!» Згадзіцеся, цікавы ход для папулярызацыі не толькі айчынных цукерак, але і, мусіць, для бульбы, якая перажывае не лепшыя часы. А вось рашэнне назваць гэты набор «Белорусской картошкой» (уверсе дробнымі літарамі пазначана «цукеркі «Беларуская бульба») падаецца даволі спрэчным. Бо менавіта з бульбай, а не з картошкой пэўным чынам атаясамліваецца Беларусь, і нездарма нас называюць бульбашамі. І, скажам, калі сярод тых жа расіян, патэнцыйных спажыўцоў гэтых цукерак, правесці апытанне, то няўжо шмат знойдзецца тых, хто не разумее слова «бульба»?

Здараюцца і элементарныя граматычныя памылкі. На этыкетцы да аднаго з падарункавых набораў чытаем: «Падарункавыя цукерки» (а не цукеркі). А назва крамы быццам і прэтэндуе на беларускі каларыт, аднак, чыста беларускае слова «журавінка» падмяняецца «журавинкой».

Хоць здараюцца і прыемныя для беларускай мовы выключэнні. На тым жа Грандзіцкім рынку ёсць павільён з дзесяцігоддзямі праверанай на прасторы былога СССР назвай «Соки. Напитки». А побач — «Смаката». Сетка крамаў (арэхі і сухафрукты). Альбо яшчэ параўнайце: «Колбасный павильон» і «Каўбаска, калі ласка!».

Вядома ж, пакупніка перш за ўсё прывабліваюць якасцю, коштам і асартыментам прадукцыі. Але і назва, мова — гэта таксама элементы іміджу вытворчага альбо гандлёвага прадпрыемства. І ў сваёй краіне, і за яе межамі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 21 (67)

«НАВОШТА ЗМАГАЦЦА ЗА МОВУ?»

— Для мяне беларуская мова цяпер — як латынь. Прыгожа, але існуе толькі ў творах Караткевіча, — кажа мая блізкая сяброўка-філолаг, якая некаторы час у школе выкладала беларускую мову. — Ты ж разумееш, калі я чую беларускую мову, адразу думаю: што прымушае гэтага чалавека гаварыць па-беларуску ў рускамоўным асяроддзі? Прыходжу да высновы, што гэта можа быць: або нейкая асаблівая грамадзянская пазіцыя, або сіла волі, або манера. І ў любым выпадку гэта няшчыра.

Мне складана спрачацца з сяброўкай, якая ў нечым мае рацыю і пры гэтым не страціла пачуцця сапраўднай любові да беларускай мовы. Калісьці менавіта яна вучыла мяне правільнаму вымаўленню і правапісу па-беларуску. Мы разам узгадваем у сваім асяроддзі беларускамоўных людзей і зноў жа прыходзім да выніку, што ў Гомелі ўсіх сапраўдных знаўцаў, якія карыстаюцца мовай у побыце, бадай што можна пералічыць па прозвішчах. Сумна.

Дзяўчаты, якія вучацца на беларускім аддзяленні філфака, за рэдкім выключэннем, трапляюць туды толькі таму, што дакладна ведаюць: на рускае паступіць ведаў не хопіць. Потым яны прыйдуць у школу, і магчыма, будучы наш калега, а пакуль вучань апошняга класа, які марыць аб журналістыцы, мне будзе скардзіцца, што яго настаўніца беларускай з непрыкрытай пагардай ставіцца да прадмета, які выкладае... Ён бы і хацеў ведаць лепш родную мову, але ж прыкладаў вакол — няма.

— Мне сумна, што мой сямігадовы сын, які не мог ад мяне чуць штосьці дрэннае пра беларускую мову, рэагуе адмоўна на яе гучанне. Я не магу зразумець, дзе крыніца такога стаўлення. Тым больш што ў прафесіяналізме настаўніцы пачатковых класаў я не сумняваюся, — працягвае мая сяброўка. — Гэта ж вельмі маркотна, калі дзіця загадзя дрэнна ставіцца да таго, што яно ўвогуле не ведае.

Вось такі аналіз хібаў адукацыі і выхавання... Мы доўга шукаем станоўчыя прыклады хоць бы ў сваім стаўленні да мовы.

— А ведаеш, мне падабаецца, калі на чыгуначным і аўтобусным вакзалах аб-весткі робяць на дзвюх мовах. Здаецца, гучыць вельмі натуральна.

— Так, натуральна гучыць, калі ёсць натуральнае вымаўленне. А вось ўздрыгваеш між волі тады, калі чуеш па тэлевізары ад вядучай інфармацыйнай праграмы, напрыклад: «картЫна». Відаць, дзяўчына вельмі старалася... Раздражняе занадта стараннае вымаўленне нашых беларускіх сугучнаў і гукаў: «дз», «дж», «ц», «г», «ч» — з такім націскам на гэтыя літары, што калі б на паперы, дык атрымалася б дзірка.

— За тры месяцы, пакуль я працую ў паліграфічнай фірме, толькі адзін раз нам замовілі візітную картку на беларускай мове. І адзін раз мы рабілі «расцяжкі», на якіх былі напісаныя заклікі па-беларуску. Усё астатняе — толькі па-руску...

Я прыпыняю разважанні і падыходжу да банкамата. Ён выбар прапануе — аперацыі можна праводзіць у тым ліку на беларускай мове. Уважліва сачу за тым, што разумная машына «гаворыць» мне зрабіць. Адна з аперацый такая: «ВЫДАЧА НАЯЎНЫХ **НАБОР** ЗАПЫТАНАЙ СУМЫ». Можа, я што ў тэрмінах іх банкаўскіх пераблытала? Уваходжу ў банкамат па-руску. Тая ж аперацыя: «ВЫДАЧА НАЛИЧНЫХ НАСЧЁТ ЗАПРОШЕННОЙ СУММЫ». Пытанне застаецца толькі адно: каго ж яны запрасілі ў перакладчыкі, што так машыну запраграмавалі? Відаць, прафесіяналу грошай не хапіла заплаціць, сваімі сіламі абышліся — такі і вынік. Хоць слоўнік дае пераклад без варыянтаў: «НАСЧЁТ — *предлог с род.* **наконт** *(каго-чаго)*».

Яшчэ адна дробязь. Аўтавакзал, таблічка ў акенцы: «Кошт жэтона для камер хавання багажу 670 р.» «Камера хранения багажа» перакладаецца як «камера для захоўвання багажу». Калі перакладаць з рускай «калькай», атрымліваецца сапраўды не вельмі прыгожа: «Кошт жэтона **для** камер **для** захоўвання багажу». Як расправіцца з двума прыназоўнікамі «для» і захаваць празрысты сэнс? Загадка для стылістаў. Загадак такіх, дарэчы, дастаткова. Яшчэ адна: паўсюль у двух варыянтах сустракаецца: «палаца-паркавы ансамбль» і «палацава-паркавы ансамбль». Як правільна? Так, як хтосьці адноўчы запісаў у юрыдычных дакументах канкрэтнай установы, — мне адказваюць. Вось тут ніякіх недакладнасцяў не павінна быць. Пакуль навукоўцы вырашаюць, як прывесці да агульнага ладу правілы нашай мовы, часта сустракаешся з пытаннем — а навошта трэба гэта ўвогуле рабіць, ніхто ж на ёй не размаўляе?

Звычайна я адказваю так: а па-руску вы «грамотно разговариваете»? Беларуса ў Расіі вылічваюць толькі па адной фразе: «Я смеюсь с неё». Абсалютнай большасці нават у галаву не прыйдзе, дзе тут памылка — між тым, тыповая, звязаная з нашым беларускім спосабам мыслення. Нас, з нашым прыродным «гэканнем» і «чэканнем» многія ўсходнія суседзі заўсёды будуць лічыць халопамі паўночна-заходняга краю, і ніколі — рускімі. І нават калі гукі «г» і «ч» вы навучыцеся вымаўляць па-руску, толькі ў адзінак атрымаецца язык перамясціць з паднябення на зубы і па-руску вымавіць мяккія «д» і «т». І нам зноў скажуць пра наша «дзеканне» і «цэканне». І шмат хто будзе па-ранейшаму зневажаць назву нашай краіны. Змаглі ж расіяне за некалькі гадоў вывучыць, што на іх мове пасля падзелу СССР «Таллін» стаў «Таллиннам», а «Ашхабад» — «Ашгабадам», чаму тады ім так цяжка ўцяміць, што ёсць краіна пад назвай «Беларусь»? Карацей, зручней, прыгажэй, чым «Белоруссия». І адпавядае Канстытуцыі нашай краіны. Але ж гэтую песню спявалі неаднаразова.

— Навошта змагацца за сваю культуру і мову, калі можна прыстасавацца да таго, што ёсць у жыцці? — пытаюць мяне знаёмыя. І гэта пазіцыя. — Мы ж не яўрэі, каб адраджаць забытую мову, якую лічылі мёртвай.

А мо сапраўды, гэтага нам і не хапае — барацьбы за сваю мову, культуру, нацыю, дзяржаўнасць... Так, доўгі савецкі час беларуская мова і фальклорны каларыт былі блізкімі сваякамі. І свядомасць людская, якую адным росчыркам не павернеш у іншы бок, добра гэта ўцяміла. І ўсё ж наша мова не толькі элемент экзотыкі, нейкага мясцовага каларыту. Нядаўна адна мая суразмоўца пасля інтэрв'ю на экалагічную тэму доўга і зацікаўлена распытвала мяне, якім чынам дарасламу чалавеку лягчэй вывучыць беларускую мову. (Я, між тым, зусім не лічу, што ведаю яе дасканала). Відаць, самае галоўнае — гэта жаданне. Спасцігнуць тое, што ты яшчэ ў жыцці не спасціг. Пакуль.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Погляд: рабі, як я?

300 спартанцаў беларускай культуры

Беларуская мова ў Мінску — рэдкі від. У паспяхова зрусіфікаванай камуністамі краіне — адпаведная сталіца. Мода на грэблівае стаўленне да беларускай мовы пайшла пасля апошняй вайны. Тады ў Мінску засталося каля 50-80 тысяч чалавек, зараз — пад 2 мільёны. Пасля смерці Сталіна, калі людзям выдалі пашпарты, вяскоўцы выправіліся ў горад шукаць лепшае долі. Да таго ж, паводле хітрага савецкага плана, людзей «тасавалі» між саюзнымі рэспублікамі — каб сцерці іх нацыянальную адметнасць, зрабіць іх аднолькавымі, касмапалітамі.

Тады і з'явілася гэта грэблівае азначэнне — «калхозьнік». Не, яно не было сінонімам «калгасніка» — чалавека, які працуе ў калгасе, на зямлі. Яно грунтавалася на недасканалым веданні рускай мовы, на прыродным беларускім акцэнце. Савецкі чалавек мусіў размаўляць выключна на «великом и могучем». А каму гэта не зусім удавалася — той «калхозьнік». І калі ў вёсцы моды на рускую мову не было, як няма і зараз, то «гарадскія» людзі мусілі выключна «абшчацца», а не «размаўляць». А шмат хто з тых, што прыехалі сюды з усяго Саюза, пасмейваліся над беларусамі за іх «г», «ч» і «дз». І пазаўчарашнія вяскоўцы ў такт пасмейваліся над вяскоўцамі ўчарашнімі.

Я шчаслівы, што не памятаю Савецкага Саюза. Што пайшоў у школу ў 1993 годзе — і грамату за першыя класы меў ужо з гербам незалежнай Беларусі. Тады адраджаліся беларускамоўныя школы, але мае бацькі, як узорныя савецкія людзі, аддалі сына ў адзіную ў раёне рускамоўную — мяркуючы, што там адукацыя лепшая. Лёс усё вярнуў на свае месцы — і сын вырас годным беларусам.

Калі я вучыўся ў 7 класе, то па сваёй ініцыятыве пазнаёміўся з народным паэтам Беларусі Рыгорам Барадуліным. Мова Дзядзькі Рыгора ўразіла мяне. Я стаў хадзіць на літаратурныя вечарыны, канцэрты беларускіх музыкаў, пазнаёміўся з гісторыкамі, мастакамі, навукоўцамі, пісьменнікамі...

Ведаеце — гэта зусім іншы свет. Гэта свет культурнага і інтэлектуальнага дыялогу, свет еўрапейскага мыслення, свет любові да гісторыі сваёй краіны, яе мовы і культуры.

Ці ўтульна мне ў сённяшнім Мінску? Я часам задаюся гэтым пытаннем. Мой асабісты свет — беларускі па духу і мове. Пераважная большасць маіх сяброў і знаёмых размаўляе па-беларуску. Пераважная большасць найлепшых інтэлектуалаў Беларусі — таксама. Ніхто мяне не пераканае ніколі, што беларус можа напісаць нешта вартае па-руску ці на якой іншай мове. Няма такога паняцця, як «рускамоўная літаратура Беларусі». Ёсць руская літаратура (паводле мовы) і беларуская (таксама паводле мовы).

Агмень Беларушчыны заўжды падтрымлівалі 300 спартанцаў. Ёсць яны і сёння. Таму калі нехта крычыць, што «мова гіне» — гэта не апошні крык. Мова гэтаксама гінула і пад царскім прыгнётам, і пад прыгнётам панскім. Як гінула ў час Багушэвіча, гэтак гіне і зараз.

А мы, наіўныя, радуемся, калі пачуем беларускае слова ў тралейбусе, на рэдкай-рэдкай рэкламе, з радыё... Прызнаемся сабе: беларуская мова ў шырокім грамадстве заняла батлейкавую ролю. Ролю шыльдаў і абвестак у транспарце. Калі ты сёння ў Мінску гаворыш у транспарце па-беларуску, на цябе глядзяць альбо як на вар'ята, альбо называюць «апазіцыянерам». Я не вар'ят — ёсць даведка. І не апазіцыянер — ніколі не быў ні ў якім палітычным руху ці партыі. Я беларус — вось мая рэлігія і мова, вось мой дух і мая роля.

І прыцягнуць людзей да беларушчыны можна толькі сваім прыкладам — каб яны пераканаліся, што ты ні першае, ні другое — а нармальны адукаваны хлопец, якому ёсць што сказаць.

...Тры гады таму я напісаў зычлівы ліст на фабрыку «Камунарка». Маўляў, дзякуй вам за такія смачныя цукеркі, але давайце напішам на іх на дзвюх дзяржаўных мовах. І прапанаваў свае бясплатныя перакладніцкія паслугі. Кіраўніцтва фабрыкі ўспрыняло прапанову з вялікім энтузіязмам. Я за месяц ці два пераклаў іхныя 500 назваў цукерак і шакаладак. На падзяку мне зладзілі экскурсію па фабрыцы, пасля якой я не мог бачыць цукеркі ці не год. І вось цяпер у краме вы купляеце «Чырвоны Каптурок», «Конік», «Свавольнік Алёшка», «Гарэза»...

Чым казаць, што мова гіне, давайце зойдзем такімі вось марудным штодзённымі справамі. Калі будзе 300 спартанцаў, нацыя выжыве.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

«Іголку я трымаю даўжэй, чым жыву»

Птушак у доме Вольгі Шкурская проста безліч. Галубы, салоўкі, паўліны розныя, безназоўныя птушкі і зусім невядомыя, але вельмі прыгожыя. Не, самі яны, зразумела, без умелых рук майстрыхі, прыляцець не здолелі б. Без яе багатай фантазіі і неверагоднага працалюбства не прыселі б на фіранкі, падушкі і прасціны, настольнікі і шторы, ручнікі, не заляцелі б у карціны з рамамі і без. Дзіўны птушыны свет у сялянскім доме прымушае сцішыцца і з замілаваннем азірацца навокал. Амаль услухоўвацца. А раптам... заспяваюць?!

«Іголку я трымаю даўжэй, чым жыву», — зусім без жартаў кажа гэта жыхарка вёскі Вынісцы, колішняя калгасная даярка, цяпер — прызнаная на Случчыне народная майстрыха-вышывальшчыца. У мяне ж адчуванне, быццам яна з іголкаю насамрэч нарадзілася. Вольга Рыгораўна не развітваецца з ніткамі, іголкамі і кручкамі з 1960 года. Навучылася ад маці — некалі першай вясковай краўчыхі, узяла дзяўчынкаю ў рукі нажніцы, каб выразаць сняжынкі на спадніцу, і адкрыла ў сабе здольнасці не толькі адчуваць і бачыць, але і ствараць.

«Я і на ферме вышывала, — кажа «птушачніца», — падаю кароў і, пакуль прыйдзе малакавоз, паспею шмат сцяжкоў зрабіць». Гэткі азарт у Вольгі Рыгораўны з часам не слабее. І таму, што дома яе разумеюць, і ў аддзеле культуры не забываюць. Была ўдзельніцай рэспубліканскіх «Дажынак» у Слуцку, свята 900-годдзя Барысава, двойчы на тэлебачанне запрашалі. Але талентаў у Вольгі куды больш, чым здаецца пры першым знаёмстве. Віртуозна пляце кошыкі, была адной з першых надомных майстрых слуцкай фабрыкі мастацкіх вырабаў. Малюе, любіць і гадуе кветкі, умела гаспадарыць на агародзе. Ранняй бульбы высаджвае на сваіх сотках ажно 28 (!) гатункаў. Яшчэ ў яе чатыры ўнукі, чатыры ўнучкі і дзве праўнучкі. Для сваіх нашчадкаў яна не шкадуе ні вачэй, ні пальцаў і натхнёна шые на падушачках вясёлых і квяцістых птушанят.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Слуцкі раён.

Занатоўкі мастака

СЯБРЫ ВЕЧАРОВЫЯ І РАНІШНІЯ ТАВАРЫШЫ

З ранішнімі таварышамі я п'ю каву, гавару хутка, паводжу сябе тэмпераментна і бадзёра. З ранішнімі таварышамі ў мяне ўсё выдатна, а вось з вечаровымі сябрамі пачаліся праблемы. Надышла летняя цяплынь, і яны пасыходзілі ў запоі. У цёмныя халодныя вечары я з імі яду доўгія размовы пра таемныя супольнасці ды геапалітычныя тэндэнцыі, пра гішталі і метафізіку адсутнасці. А тут — банальныя і брутальныя запоі. Мае вечаровыя сябры перасталі галіцца, замест галення яны з самай раніцы п'юць гарэлку, каб удзень заваліцца спаць, а ўвечары сядзець у змрочным настрої. Таму ў апошнія дні я не хаджу вечарам у сваю кавярню «Акварыум». Цяпер праводжу вечары за чытаннем крытычных артыкулаў пра святыя дабравесці і займаюся вывучэннем тэкстаў пра таемную вячэру з удзелам Хрыста ды апосталаў.

ЛЁСЫ АПОСТАЛАЎ

Праца з сюжэтам «Таемная вячэра» прывяла мяне да знаёмства з лёсамі апосталаў, што прысутнічалі на ёй з Ісусам Хрыстом. Лёсы ў іх страшныя... Здраднік Юда Іскарыёт задавіўся. Апостала Фадзея засеклі мячом. Апостала Пятра распялі ўніз галавою ў Рыме. Апосталу Якаву (старэйшаму) адсеклі галаву. Апостал Андрэй быў распяты на касым крыжы. Апостала Якава (малодшага) скінулі з Іерусалімскага храма, і ён разбіўся насмерць. Апостала Піліпа распялі дагары нагамі. З апостала Барталамея жыўцом садралі скуру. Апостала Тамаша забілі стралою падчас малітвы. Апостала Сымона (Зілота) распялі. З апостола Мацея садралі скуру. Адзіны з іх, хто памёр сваёй смерцю, — апостал Ян, але і ён памёр у зняволенні. Жахлівая гісторыя... Застаецца паўтарыць: «У вялікіх ведах вялікі сум...»

ДВАЙНІК І ДВАЙНІЦА

У мяне завёўся двайнік! Пазаўчора яго разам з маёй жа жонкаю нібыта бачылі каля шакаладнай фабрыкі «Камунарка». Не гуляю я каля той фабрыкі! І жонка мая не гуляе каля «Камунаркі». Прынамсі, пазаўчора маёй жонкі там дакладна не было. Жонка ў Монтэ-Карла, а я днямі навылёт сяджу ў майстэрні і пішу невялічкія палотны з яблыкамі ды грушамі. Часам я спускаюся ў кавярню «Акварыум», а потым зноў падымаюся ў майстэрню. У «Акварыуме» я і даведаўся пра свайго двайніка. Валера бачыў яго каля «Камунаркі», а Віктар сягоння сустрэў каля гадзіннікавага завода «Прамень». Чаму двайнік ходзіць увесь час з двайніцай маёй жонкі? Бог з ім. Хай ходзіць як хоча, куды хоча і з кім хоча. Галоўнае, ён не ходзіць з маёй жонкай.

ПРАДАВАЧКА І НАЦЮРМОРТ

Дамовіўся з унукам, што той прыйдзе ў майстэрню памаляваць. Каб практычнае сумясціць з прыемным, я пайшоў у краму набыць рознакаляровай садавіны. Я выбіраў жоўтыя і чырвоныя яблыкі для нацюрморта, а потым папрасіў прадавачку ўзважыць вялікую зялёную грушу. «Мне патрэбна самая прыгожая, самая смачная груша! — сказаў я і дадаў: — Мне ж у бальніцу трэба...» — «Калі вам у бальніцу, я зараз знайду яшчэ большую і яшчэ лепшую грушу...» Чаму я раптам сказаў пра бальніцу? Надакучыла мне нахабства прадавачак садавіны і гародніны, а скажы ты ёй пра бальніцу — і прадавачка робіцца цалкам нармальным чалавекам, яна нават зрабілася ветлівай. Дзякучы спагадлівай прадавачцы, нацюрморт у мастэрні стаіць выдатны, і ў Вовы на палатне ўсё добра атрымалася, і можна пачынаць есці грушу... Сапраўды, смачная! Не падманула прадавачка, і не падманула толькі таму, што падманулася сама.

ШЫЛЕР І ПІНДРЫК

На вуліцы Кузьмы Чорнага ў адным дварэ жылі мае раўналеткі Шылер і Піндрык, немец і яўрэй. Ім было цяжка. Аднаго называлі «фашыстам», другога — «жыдам». Савецкі антысемітызм, як і савецкі антыгерманізм, — з'явы брутальныя. Шмат хто з немцаў і яўрэяў не вытрымліваў гнятлівага ціску ды мяняў прозвішча. Шылеры перараблялися ў якіх Шытавых, а Піндрыкі — у якіх Пятровых. Мае суседзі былі хлопцамі зацятымі, яны не толькі не збіраліся мяняць прозвішчы, яны ўсяляк падкрэслівалі ўласную адметнасць. Шылер насіў на правай руцэ чорную скураную пальчатку і быў заўжды гатовы да бойкі. Піндрык заўсёды меў грошы, мог шмат чаго купіць і пазычаў рублі пад працэнты. Шылер лічыў сябе моцным, а Піндрык — разумным. Здарэнне, пра якое я збіраюся распавесці, вымагае пэўнага ўдакладнення акалічнасцяў. У тагачаснай савецкай імперыі былі адны сапраўдныя духі — «Красная Масква». У кожнай сям'і меўся флакон у выглядзе крамлёўскай вежы. Дзецям крануць флакон забаранялася. Большасць тых крамлёўскаформенных флаконаў, што ўпырагожвалі этажэркі, серванты ды трумо, былі пустымі. А так хацелася панюхаць чароўны водар раскошы... Шылер з'явіўся ў дварэ з флаконам «Краснай Масвы». Піндрык за дзесяць капеек купіў дазвол першым панюхаць духі. Ён заціснуў пальцам адну ноздру і з усяе моцы ўцягнуў паветра. Вочы Піндрыка закаціліся, ён страціў прытомнасць і ўпаў. Шылер пільна ўглядаўся ў збялелы твар Піндрыка, бо сачыў за эксперыментам. Папярэдне ён наліў у флакон нашатырны спірт. Праз колькі хвілін Піндрык ачуняў і разам з усім дваром смяяўся. Тады і я смяяўся...

СТАНДАРТ

Дзяўчына спытала ў мяне: «Ці прыйшоў час, каб змяніць стандарт жаночай прыгажосці 90-60-90?» — «Прыгажосць вымяраецца каханнем і любоўю, а не сантыметрамі».

Адам ГЛОБУС.

Нечакана

«ВЁСКА» СУПРАЦЬ «ДЗЯРЭЎНІ», альбо Як родная мова дапамагае змагацца з дэпрэсіяй

Вяртанне беларускай мовы ў штодзённае жыццё можа стаць важкай мерай у прафілактыцы самагубстваў. Так лічыць Ігар САРОКІН, псіхіятр, які працуе ў гарадскім псіханеўралагічным дыспансэры горада Мінска. І ў яго ёсць аргументы на карысць беларускай, якія былі дасягнутыя шляхам вялікай прафесійнай і жыццёвай практыкі:

— Беларусь уваходзіць у лік краін з высокім узроўнем самагубстваў. Такой жудаснай статыстыкі няма ні ў адной краіне свету акрамя, магчыма, Прыбалтыкі і тых, што знаходзяцца на поўначы Еўропы, — але там крыху іншыя прычыны, — тлумачыць Ігар Георгіевіч. — Па прычынах смерці самагубства ў Беларусі займае 4-е месца і апярэджвае смерць у дарожна-транспартных здарэннях. У апошнія дзесяць гадоў узровень самагубстваў у нашай краіне трымаецца на адзнаках паблізу 30 на 100 тысяч насельніцтва. Гэта значыць, што праз самагубства штогод знікае насельніцтва малога горада Беларусі. Самагубства здзяйсняюць асобы, якія знаходзяцца ў дэпрэсіўным стане рознай глыбіні і працягласці. Прычыны дэпрэсіі могуць быць розныя: біялагічныя і псіхалагічна-сацыяльныя. Біялагічныя фактары больш-менш паспяхова спрабуюць кантраляваць медыкі. Але на псіхалагічна-сацыяльныя прычыны можа паўплываць дзяржава такім чынам, што колькасць дэпрэсій і самагубстваў будзе зніжацца. Якім чынам?

Сутнасць у тым, што пры дэпрэсіі ў першую чаргу церпіць самаацэнка чалавека. Пакуль чалавек паважае сябе, сваіх продкаў, дасягненні свайго народа, з настроем у яго ўсё добра. А ці можа паважаць сябе, сваіх продкаў, свой народ чалавек, які адарваўся ад сваіх каранёў і ігнаруе сваю родную мову? Гэта спрыяе таму, што чалавек аднойчы можа страціць трывалую глебу пад нагамі, калі яго насамрэч нішто не ўтрымлівае на гэтым свеце. Мова — гэта повязь з мінулымі пакаленнямі, гэта думка пра тое, што не з цябе ўсё пачалося і не на табе скончыцца. Вось дзеля гэтага працягу, дзеля перспектывы самой краіны важна вярнуць беларускую мову ў наша жыццё.

Лічу, што калі ў нашай краіне здолелі захаваць эканоміку, то выкананне гэтай задачы таксама магчымае. Захаваць людзей, якія здольныя паспяхова працаваць, — хіба гэта не дзяржаўная задача?

— Звычайна гэтыя праблемы разглядаюць асобна, адно з другім не звязваючы. Але калі капнуць, то, магчыма, карані насамрэч ідуць глыбока... Што вас падштурхнула да гэтай думкі?

— Я псіхіятр, ведаю, што такое дэпрэсія, чым яна небяспечная, як праяўляецца, у тым ліку ў суб'ектыўным плане. Што значыць нізкая самаацэнка? Чалавек пачынае думаць, што ён самы горшы, што ён нічога не варты і ва ўсім, што ў ягоным жыцці было, ён вінаваты перад усім светам — перад блізкімі, перад калегамі і гэтак далей. Там памылка, там — памылка. Усё, што было з ім — гэта чарада памылак, больш за тое — і напярэдзе нічога не чакае, толькі чарната і змрок. А калі чалавек пазбаўлены веры... У нас за савецкім часам была меншая колькасць самагубстваў. У пэўнай ступені з-за таго, што была нейкая вера. Цяпер веры ніякай няма...

— Вярнуць чалавека ў царкву няпроста...

— Безумоўна, значна прасцей павярнуць маладых людзей да піва дзякуючы рэкламе, і прымусіць іх зрабіць нешта іншае, не вельмі добрае, што потым прывядзе да дэпрэсіі. Амаль ва ўсіх людзей у дэпрэсіўным стане ёсць думкі аб самагубстве. Бывае, што яны з'яўляюцца ў людзей здаровых. Гэтыя думкі могуць быць мімалётныя, абумоўленыя канкрэтным момантам, але праходзіць кароткі час, ці трошкі болей, чалавек трымаецца і бачыць, што адчуванне безнадзейнасці знікае. Калі ўзнікае спалучэнне біялагічных фактараў з сацыяльнымі, рызыка для жыцця павышаецца. Бо за савецкім часам чалавек жыў як у Хрыста за пазухай: у свой час прыходзіла кватэра, машына і так далей. Усяго можна было дачакацца. Сучаснае жыццё такое, што ніякай пэўнасці няма, чалавек павінен увесь час даказваць іншым і сабе самому, чаго ён варты, нібыта змагаецца за жыццё. Вы ж паглядзіце, як людзі нашы ходзяць — яны ж усе панурыя, глядзяць пад ногі, у лепшым выпадку. У горшым — адчуваецца нейкая агрэсія. Агрэсія ў любым выпадку заканчваецца самаагрэсіяй, самаабвінавачваннем. Сёння ты адчуваеш агрэсію — гэта можа доўжыцца і дзень, і два, а можа хвіліну. Непазбежна ўзнікне адчуванне таго, што ты вінаваты ў чымсьці. Так уладкавана псіхіка. Ты сёння шлёпнуў сваё дзіця, але пашкадуеш калі не праз пяць хвілін, дык заўтра, калі не заўтра, то ўсё адно некалі прыйдзе адчуванне таго, што калісьці ты беспадстаўна сваё малое пакрыўдзіў. І ты будзеш пакутаваць ад гэтага. А колькі агрэсіі ў нашым грамадстве, калі людзі глядзяць на іншых, як на ворагаў. У кожнага з нас гэтых ворагаў безліч.

Аднак свая мова дае адчуванне еднасці: ніколі не змагу сваімі рукамі, ці думкай, ці дзеяннем, пашкодзіць каму-небудзь са сваіх... Па вялікім рахунку ўласная мова стварае нейкую жыццёвую перспектыву. Яна дае надзею на тое, што мы будзем жыць, трымаючыся адно аднаго. А так — уся наша перспектыва: тут і цяпер. І ўсе мы — невядома адкуль.

— Напэўна, мы ўсе глыбока ў душы ведаем і разумеем — адкуль...

— Трэба звярнуць увагу на тое, што беларусы архетыпова — вельмі патрыярхальныя. Архетып — гэта тое, што складае псіхалагічны касцяк усіх асобных адзінак нацыі. Вядома ж, цяперашні лад жыцця і ўсё большая схільнасць людзей да алкаголю вядзе да таго, што разбуральна сувязі паміж суродзічамі. Больш за тое, маладыя перастаюць паважаць старэйшых, з розных прычын. Калі не галоўную, дык значную ролю ў гэтым адыгрывае алкаголь.

Але па сутнасці мы кансерватыўная нацыя. Мы прызвычаіліся да таго, што ёсць бацькі, іх трэба шанаваць — так складвалася пакаленнямі. І было так, што вясковыя бацькі вылузваліся са скуры, каб дзеці выйшлі ў людзі. Паехаў чалавечак малады ў горад — і пачынаецца яго адрыў ад іх. Не ў сэнсе адлегласці, а ў моўным сэнсе: у горадзе ж усе не так гавораць, ці робяць выгляд... Ён пачынае лічыць, што бацькі няправільна размаўляюць, не так яго вучылі. У горадзе ж хутка навучаць: усё, што рабілася раней — было няправільна. Пачынаюць перарывацца сувязі паміж пакаленнямі, на маю думку, таму, што бацькі калісьці ў вёсцы гаварылі па-беларуску, а нам не падабаецца, мы лічым, што гэта не гарадская мова, так гаворыць толькі «дзярэўня». Нават не «вёска» ці «сяло», а кажуць жа «дзярэўня». Пачынаецца комплекс, калі чалавек спрабуе перавучыць сябе нібыта «на гарадскога».

Немалую ролю ў прыніжэнні адыгрывае тое, што мы чуем з экрана тэлевізара. Цяпер вельмі распаўсюджаныя перадачы з гумарыстамі. Але калі ўслухацца, то шмат якія гумарэскі пабудаваныя на асаблівасці нейкіх гаворак, на тым, што простыя вясковыя людзі ў іх сапраўды выглядаюць «лахамі», як кажуць. Забаўлялкі тэлевізійныя часта пабудаваныя на тым, што ёсць дурань-лапатнік, які гаворыць на нейкай перакручанай мове, якая вельмі нагадвае

г. ВИТЕБСК **1 октября 2009 г.**

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ПОД РАЗМЕЩЕНИЕ ЛОГИСТИЧЕСКИХ ЦЕНТРОВ

ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ФОНД «ВИТЕБСКОБЛИМУЩЕСТВО»

№ лота	Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка, арендодатель	Характеристика расположенных на участке строений	Площадь земельного участка, в га	Срок аренды, лет	Назначение участка	Условия продажи	Начальная цена предмета аукциона, руб.	Сумма задатка, руб.
1.	Земельный участок расположен по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, Солонинский с/с в р-не д. Богатырская (0,2 км юго-восточнее г. Полоцка). Кадастровый номер 223886000001000021. Арендодатель земельного участка – Витебский областной исполнительный комитет	Неиспользуемые земли, ограничение в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи напряжением свыше 1000 В. 0,5500 га – пахотные земли, 9,9700 га – луговые земли из них 6,3000 га – луговые улучшенные, 17,9040 га – древесно-кустарниковая растительность, 0,0900 га – болота	28,5140	20	Под строительство логистического центра	- возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме **317 181,4 тыс. рублей** на транзитный счет Управления государственного казначейства Витебской области, открытый для районной инспекции Министерства по налогам и сборам по месту постановки на учет плательщика на раздел 52, подраздел 01 (код платежа 05201), связанные с изъятием 10,52 га сельскохозяйственных земель для нужд, не связанных с ведением сельского хозяйства; - заключить с Полоцким райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после принятия решения райисполкомом о предоставлении земельного участка государственную регистрацию права на этот участок; - получить в установленном порядке разрешение Полоцкого райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство логистического центра в срок, не превышающий двух лет; - в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации возникновения права на предоставляемый земельный участок приступить к занятию данного участка; - снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его в соответствии с проектно-сметной документацией; - осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	**20 410 710**	**2 041 071**
2.	Земельный участок расположен по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, Боровухский с/с в районе д. Коптево (1,5 км севернее г. Новополоцка). Кадастровый номер 223881400001000056. Арендодатель земельного участка – Витебский областной исполнительный комитет	Ограничение в использовании земельного участка в связи с расположением в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы (р. Западная Двина). 20,3200 га – пахотные земли, 0,4000 га под болотами, 3,3179 га под древесно-кустарниковой растительностью, 0,4100 га под дорогами.	24,4477	20	Под строительство логистического центра	- возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме **1 972 589,93 тыс. рублей** на транзитный счет Управления государственного казначейства Витебской области, открытый для районной инспекции Министерства по налогам и сборам по месту постановки на учет плательщика на раздел 52, подраздел 01 (код платежа 05201), связанные с изъятием 20,32 га пахотных земель для нужд, не связанных с ведением сельского хозяйства; - заключить с Полоцким райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после принятия решения райисполкомом о предоставлении земельного участка государственную регистрацию права на этот участок; - получить в установленном порядке разрешение Полоцкого райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство логистического центра в срок, не превышающий двух лет; - в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации возникновения права на предоставляемый земельный участок приступить к занятию данного участка; - снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его в соответствии с проектно-сметной документацией; - осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	**45 878 890**	**4 587 889**
3.	Земельный участок расположен по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, Ветринский с/с 0,5 км южнее г.п. Ветрино. Кадастровый номер 223881700001000058. Арендодатель земельного участка – Витебский областной исполнительный комитет	Ограничения в использовании земельного участка в связи с расположением в водоохранных зонах вне прибрежных полос (озера Пашуты и Ветрино) и в охранных зонах линий электропередачи напряжением свыше 1000 В. 25,8500 га – пахотные, 0,3900 га – луговые, естественные, 20,3525 га под древесно-кустарниковой растительностью, 6,7600 га под болотами, 0,0900 га под водными объектами, 0,1500 га под дорогами, 1,2800 га – прочие неиспользуемые.	54,8925	20	Под строительство логистического центра	- возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме **3 309 942,23 тыс. рублей** на транзитный счет Управления государственного казначейства Витебской области, открытый для районной инспекции Министерства по налогам и сборам по месту постановки на учет плательщика на раздел 52, подраздел 01 (код платежа 05201), связанные с изъятием 26,32 га сельскохозяйственных земель для нужд, не связанных с ведением сельского хозяйства; - заключить с Полоцким райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после принятия решения райисполкомом о предоставлении земельного участка государственную регистрацию права на этот участок; - получить в установленном порядке разрешение Полоцкого райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство логистического центра в срок, не превышающий двух лет; - в течение шести месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации возникновения права на предоставляемый земельный участок приступить к занятию данного участка; - снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его в соответствии с проектно-сметной документацией; - осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	**10 675 010**	**1 067 501**
